Комуністычная партыя (большэвікоў) Беларусі

ЗВЯЗДА

Орган ЦК і МК КП(б)Б, ЦВК і СНК БССР

КАСТРЫЧНІК 15 1933 г. НЯДЗЕЛЯ № 228 (4772)

Год выдання XVII

Пролетарыі ўсіх краін, злучайцесь!

СЕННЯ У НУМАРЫ:

АРТЫКУЛЫ: ПЕРАДАВЫ — Партыйную вучобу—на узровень задач другой пяцігодкі. АГУРСКІ—Нацдзмаўская фальсіфікацыя гісторыі Беларусі.

ПАРТЫЙНАЕ БУДАЎНІЦТВА —За высокую якасць марксіцка-ленінскай вучобы.

Дапамагчы калгасніку будаваць культурнае заможнае жыццё.

Тэрмін мінуў, план збожжапаставак не выканан.

ЗА МЯЖОЙ:

Сусветны друк аб паведамленні ТАСС.

Аргументы Японіі не грунтоўны.

ПРАЦЭС АБ ПАДПАЛЕ РЭЙХСТАГА—Суд дыктуе «сведкам» іх «паказанні».

ПАРТЫЙНУЮ ВУЧОБУ--НА УЗРОВЕНЬ ЗАДАЧ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ

Сёння адкрываецца ўсебеларуская культпропнарада пры ЦК КП(б)Б. Гэта нарада падвядзе папярэднія вынікі партыйнай вучобы і вырашыць рад важнейшых пытанняў, звязаных з арганізацыяй партвучобы як у горадзе, так і ў вёсцы.

Пытанне аб аўладанні рэвалюцыйнай тэорыяй на сучасным этапе будаўніцтва соцыялізма мае выключна важнае значэнне. Уся злучасць задач нашага развіцця дыктуе неабходнасць максімальнага ўзмацнення пролетарскай дыктатуры. Вось чаму з такой вастратой стаіць пытанні далейшага палітычнага і арганізацыйнага ўмацавання нашай партыі, далейшай барацьбы ЗА ЎМАЦАВАННЕ КІРАЎНІЦТВА ПАРТЫІ, якое складае «галоўнае ў дыктатуры пролетарыята, калі мець на ўвазе кольні-небудзь моцную і поўную дыктатуру» (СТАЛІН).

Задача ўзмацнення партыйнага кіраўніцтва знайшла сваю канкрэтызацыю ў прамове тав. СТАЛІНА «Аб рабоце ў вёсцы», у пастанове студзеньскага пленума ЦК і ЦКК аб палітаддзелах і, нарэшце, у пастанове ЦК і ЦКК аб чыстцы партыі.

Умацаванне кіраўніцтва партыі ў цэлым немыслима без умацавання авангардной ролі пасобных комуністаў, без павышэння іх рэвалюцыйнай пільнасці, без павышэння іх ідэалагічнага ўзроўня. Чыстка партыі павышае партыйную дысцыпліну комуністаў, іх большэвіцкую непрымірымасць да малейшых праяўленняў апартунізма. Чыстка ўзмацняе барацьбу за непарушальнасць традыцый большэвіцкай партыйнасці і непарыўнасці слова і справы. Рэволюцыйная тэорыя цэментуе ўсе гэтыя большэвіцкія якасці, робіць комуніста стойкім і маналітным, дапамагае яму асмысленна змагацца за генеральную лінію партыі, згуртоўваць вакол яе беспартыйных, і ўмець убачыць і разбіць маскіроўку і дзеянні ворага.

Зусім зразумела таму, чаму чыстка партыі павысіла цягу шырокіх партыйных мас да марксіцка-ленінскай вучобы. Задача цяпер заключаецца ў тым, каб замацаваць гэта імкненне мас практычнай работай па арганізацыі партвучобы.

Ужо прайшоў месяц з дня пачатку асення-зімовай вучобы ў гарадскіх партыйных арганізацыях. Гэты месяц паказаў, што ахоп комуністаў і беспартыйнага рабочага актыва школамі і гурткамі значна большы, чым у мінулым годзе. Ва многіх партыйных арганізацыях палепшылася і якасць работы гэтых школ. Аднак, яшчэ не ўсюды прароблена ўсё, каб забяспечыць нармальную работу сеткі партасветы. Напрыклад, на прадпрыемствах Віцебска асабліва на фабрыцы «Сцяг індустрыялізацыі», заводах «Прафінтэрн» і «Чырвоны металіст» партвучоба яшчэ не наладжана як след, партшколы яшчэ не забяспечаны поўнасцю прапагандыстамі і падручнікамі. На швейнай фабрыцы ў Магілеве школы поўнасцю не ўкамплектаваны, не хапае прапагандыстаў. На заводзе «Большэвік» (Менск) яшчэ не ўсе кандыдаты і спачуваючыя ахоплены партвучобай. Слаба разгарнулася партвучоба ў радзе ячэек Оршы.

Фактаў дрэннай арганізацыі партасветы можна прывесці яшчэ даволі многа. Аб іх скажуць яшчэ на культпропнарадзе, якая сёння адкрываецца. Але ўсе гэтыя факты гавораць аб тым, што рад партыйных арганізацый не падышлі з усёй сур'ёзнасцю да разгортвання партвучобы, што кіраўніцтва партвучобай яшчэ не пастаўлена так, як гэтага патрабуюць сучасныя задачы.

КАМПЛЕКТАВАННЕ СЕТКІ — гэта адно з важнейшых пытанняў арганізацыі партвучобы. Таму — асабліва трэба ўлічыць гэта пры разгортванні работы школ у вёсцы. Неабходна строга выходзіць з палітычнага ўзроўня кожнага члена, кандыдата і спачуваючага. Пры чыстцы партыі даволі ясна выявіўся палітычны ўзровень комуністаў. Таму трэба ў аснову работы па ўкамплектаванню школы пакласці вывады камісіі па чыстцы, трэба, як гэта робяць многія палітаддзелы МТС і транспарта, загадзя пагутарыць з кожным пасобнику, выявіць яго запытанні і ўзровень падрыхтоўкі.

Пры ўкамплектаванні школ ні ў якім выпадку нельга ўпусціць працуючых на начных зменах і раз'язных рабочых (на транспарце і г. д.). Партвучоба павінна быць арганізавана ў зменах, брыгадах і з пасобнымі комуністамі.

Асаблівай увагі, клопатаў і пастаяннага кіраўніцтва патрабуюць да сябе кандыдацкія школы. Прапагандысты гэтых школ павінны быць забяспечаны найбольш рэгулярнай і ўсебаковай кансультацыяй і дапамогай. Кандыдацкія школы павінны ахапіць толькі кандыдатаў і спачуваючых. Для астатніх трэба ствараць спецыяльныя палітгурткі па чытанню газет, прапрацоўцы важнейшых пастаноў партыі і ўрада і г. д.

Надзвычай востра стаіць пытанне АБ ПРАПАГАНДЫСТАХ. Стаіць яно востра, па-першае, таму, што зараз мы маем павышаныя патрабаванні з боку саміх слухачоў, і, па-другое, таму, што значна вырасла сетка партыйнай вучобы. ТРЭБА ПРОСТА СКАЗАЦЬ, ШТО ЗА ПРАЙШОЎШЫ ГОД БЫЛО ЗРОБЛЕНА ВЕЛЬМІ МАЛА Ў АДНОСІНАХ ПАДРЫХТОЎКІ ПРАПАГАНДЫСТАЎ. У асаблівасці гэта адносіцца да такіх вялікіх партыйных арганізацый, як менская, гомельская, віцебская, магілеўская і бабруйская.

Прапагандысцкія кадры трэба вырашчваць і выхоўваць на практычнай рабоце. Колькі ёсць рабочых прапагандыстаў, якія яшчэ ў сярэдзіне мінулага навучальнага года кінулі гэту справу? Вельмі многа. Гэта адбываецца таму, што ім не дапамагаюць, іх мала кансультуюць, мала працуюць над павышэннем іх тэарытычнага ўзроўня. У ГЭТЫХ АДНОСІНАХ ВЯЛІКАЯ АДКАЗНАСЦЬ УСКЛАДАЕЦЦА НА ДАМЫ КОМАСВЕТЫ І КУЛЬТПРОПГАБІНЕТЫ. ГЭТЫЯ ЎСТАНОВЫ ПАВІННЫ, НАРЭШЦЕ, СТАЦЬ САПРАЎДНЫМІ ЦЭНТРАМІ КОМУНІСТЫЧНАЙ АСВЕТЫ І ВЫХАВАННЯ РАБОЧЫХ ПРАПАГАНДЫСТАЎ.

Увязка вучобы з практычнай пастаўлена яшчэ вельмі дрэнна. Часамі гэта ўвязка не дасягае мэты з прычыны невыстарчальна правільнай арганізацыі гэтага важнейшага боку ў пастаноўцы марксіцка-ленінскай вучобы. ПЕРШАЕ І ГАЛОЎНАЕ ВА ЎВЯЗЦЫ ВУЧОБЫ З ПРАКТЫКАЙ ПАВІННА БЫЦЬ ТОЕ, КАБ У СЛУХАЧОЎ ШКОЛ І ГУРТКОЎ СЛОВА НЕ РАЗЫХОДЗІЛАСЯ СА СПРАВАЙ, КАБ ВУЧОБА ВЫХОЎВАЛА Ў СЛУХАЧОЎ ДУХ ПАРТЫЙНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ І БОЛЬШЭВІЦКАЙ НЕПРЫМІРЫМАСЦІ ДА МАЛЕЙШЫХ АДХІЛЕННЯЎ АД ГЕНЕРАЛЬНАЙ ЛІНІІ ПАРТЫІ, КАБ СЛУХАЧЫ ГЛЫБОКА РАЗУМЕЛІ ДСНОЎНЫЯ ПЫТАННІ ПАЛІТЫКІ ПАРТЫІ, РАЗУМЕЛІ ЗАДАЧЫ, ЯКІЯ СТАЯЦЬ ПЕРАД КОЖНАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫЯЙ І ЎМЕЛІ ЎВЯЗВАЦЬ ІХ З АГУЛЬНАПАРТЫЙНЫМІ ЗАДАЧАМІ.

Адной з важнейшых задач партарганізацыі, адным з іх важнейшых абавязкаў — гэта ДАПАМОГА КОМСАМОЛУ Ў АРГАНІЗАЦЫІ ПАЛІТВУЧОБЫ. Прычым гэта дапамога павінна быць не на паперы, а на справе — дапамагаць прапагандыстамі, падручнікамі, метадычнай кансультацыяй і г. д.

У некаторых партыйных арганізацыях ужо разгарнулася соцыялістычнае спаборніцтва паміж школамі і паміж слухачамі (Менск, Дзяржынск, Барысаў, Заслаўе і г. д.). Гэта распачатае спаборніцтва патрэбна разгарнуць яшчэ шырэй, зрабіць яго дзейсным, мясавым і канкрэтным. ЯКАСЦЬ ПАРТВУЧОБЫ — вось што павінна быць асноўным і галоўным у соцспаборніцтве.

Пастаяннае і канкрэтнае партыйнае кіраўніцтва, самакрытыка ў сетцы партыйнай асветы, соцспаборніцтва, пастаянная дапамога прапагандыстам павінны быць тымі вагарамі, якія будуць рушыць уперад справу партыйнай асветы, і паставяць яе на ўзровень вялікіх задач другой пяцігодкі.

Усебеларуская культпропнарада

Сёння адкрываецца ЎСЕБЕЛАРУСКАЯ КУЛЬТПРОПНАРАДА па пытанню марксіцка-ленінскага выхавання ў арганізацыях КП(б)Б і комсамола.

На нараду выклікаюцца ЗАГАДЧЫКІ КУЛЬТПРОПАЎ РК КП(б)Б, КУЛЬТПРОПАЎ РК ЛКСМБ, НАМЕСНІКІ НАЧПАЛІТАДДЗЕЛАЎ ПА ПАРТМАСАВАЙ РАБОЦЕ (па выкліку палітсектара НКЗ), ЗАГ. САЎПАРТШКОЛ — менскай, магілеўскай, віцебскай, гомельскай, ЗАГ. ВЯЧЭРНІХ КОМВУЗАЎ — Віцебска, Магілева, Оршы, Менска, Барысава, Рэчыцы, Рагачова; ЗАГАДЧЫКІ ПАРТГАБІНЕТАЎ І ДАМОЎ КОМАСВЕТЫ — Полацка, Віцебска, Гомеля, Бабруйска, Барысава, Мазыра, Дзяржынска, Быхава, Петрыкова, Слуцка і Менска; ЗАГАДЧЫКІ КУЛЬТПРОПАЎ ПАРТКАЛЕТКІВАЎ ЗАВОДАЎ Гомсельмаш, імя Ланцуцкага, бабруйскага дрэваапрацоўчага камбіната, магілеўскай фабрыкі чырвана валакна, Асінторфа, фабрыкі «Сцяг індустрыялізацыі», завода «Чырвоны металіст», фабрыкі «Пролетарская перамога», заводаў імя Мяснікова, «Большэвік», імя Варашылава і фабрыкі «Кастрычнік»; САК РАТАРЫ ЯЧЭЕК КП(б)Б калгаса імя Сталіна, Слуцкага раёна, і саўгаса Вішнёўка, Менскага раёна.

НА НАРАДУ ЗАПРАШАЮЦЦА ВЫКЛАДЧЫКІ І НАВУКОВЫЯ РАБОТНІКІ-КОМУНІСТЫ г. МЕНСКА.

Нарада адбудзецца ў памяшканні Дома Комасветы і пачнецца ў 6 гадзін вечара.

КУЛЬТПРОП ЦК КП(б)Б.

Жулікі прыцягнуты да адказнасці

Праверка, праведзеная пракуратурай рэспублікі, выявіла рад фактаў шкодніцтва ў прыёмцы і адгрузцы бульбы ў Ленінграду.

Загатарганізацыі Белкаапгародніны і Белплодагародніны зусім не падрыхтаваліся да кампаніі. Ніхто не займаўся пытаннем падбора работнікаў, не быў устаноўлен штодзённы кантроль за работай пунктаў.

У **Пухавічах** здатчыкі сядзілі больш 3 гадзін на мястэчку, шукаючы прыёмшчыкаў. На складзе прастаяла каля 5 гадзін звыш 100 фурманак. Загадчык складам **Бранавец** не пакланяўся рацыяналізаваць прыёмку: тры работнікі прымалі ў адным складзе і перашкаджалі адзін аднаму ў той час, як побач ёсць зусім свабодны склад, які не скарыстоўваецца.

На складзе № 2 Белплодагародніны здатчыкі гадзінамі чакалі аплаты — у касе не было грошай, загадчык склада не натурбаваўся своячасова атрымаць у банку сумы для расплаты.

На **Барысаўскім** прыёмачным пункце загадчык — былы спекулянт **Вігдорчык** абкажваў здатчыкаў. Ён устанавіў свае правілы прыёмкі — рабіў незаконныя сходкі. Былі выпадкі, калі сам даходзілі да 25 кгр. па здатчыка.

На прыёмачным пункце на станцыі **Прыяміна** (загадчык **Луцкевіч**) прымалі бульбу скрынямі, якія ўмяшчаюць на 8 кілаграм больш вымеранай вагі.

У **Бягомльскім** раёне адгрузілі 50 тон бульбы напалову зашіўшай.

Загадчык дзяржынскай канторы Белплодагародніны **Прус** не прыняў ніякіх мер да захавання бульбы. Ужо некалькі дзён на вакзале ляжыць бульба, рассыпаная на зямлі, без усякай аховы.

На станцыі **Бобр** загатоўшчыкамі недагружана 10 занадраджаных вагонаў, на ст. Омаляшчы — адзін вагон, на ст. Комунары — 8. Кліентура злачынна аднеслася да скарыстання вагоннага парку.

Не лепш стаіць справа з прыёмкай і захаваннем плодагародніны. На заслачным пункце ў Нова-Барысаве не падрыхтаваны гародніхавальні, чаны патрэскаліся і цякуць.

Пракуратура рэспублікі прыцягнула да судовай адказнасці вінаватых у гэтых злачынствах. Адданы пад суд работнікі пунктаў Капушчын, Бранавец, Віцорчык, Луцкевіч, Рамашчук, Гран, Прус і інш.

СІМХОВІЧ і ЧАРЛЕНАК.

ТЭРМІН МІНУЎ, А ПЛАН ЗБОЖЖАПАСТАВАК НЕ ВЫКАНАН

ДА КАНЦА РАЗГРАМІЦЬ КУЛАЦКІ САБАТАЖ І САМАЦЁЧНЫЯ НАСТРОІ, НЕАДКЛАДНА І ПОЎНАСЦЮ ЗАВЯРШЫЦЬ ЗБОЖЖАПАСТАЎКІ

Пляды самацёка

У спаборніцтве з Барысаўскім раёнам па збожжапастаўках Магілеўскі раён ганебна адстае. На 10 кастрычніка Барысаўскі раён выканаў план на 89 проц., а Магілеўскі толькі на 52,3 проц.

У чым асноўная прычына адставання?

З 5.226 тон збожжа, якія раён павінен здаць па цвёрдых пастаўках, на аднаасобны сектар прыпадае больш 60 проц. Між тым, на гэты адказнейшы ўчастак збожжаздачы ў раёне зварачаюць мізерную ўвагу.

На 10 кастрычніка аднаасобнікі Магілеўшчыны выканалі план збожжаздачы на 41,1 проц., а кулакі—толькі на 6,1 проц. Кожная пяцідзіннка дае прырост па аднаасобнаму сектару не больш 3-4 проц. Гэта значыць, што такімі тэмпамі план збожжапаставак раёнам будзе выканан не раней чым праз 2-3 месяцы.

Возьмем **Гуслічанскі** сельсавет. На аднаасобнаму сектару план выканан на 33,9 проц., кулакі здалі 1,7 проц. Старшыня сельсавета Крышкевіч лічыць, што ён ўсё зрабіў для забеспячэння выканання плана. Фактычна ў сельсавеце поўны правал якой-бы ні было масавай работы сярод аднаасобнікаў, нічога не робіцца, каб прымусіць кулакоў здаць збожжа.

Або ўзяць **Бракаўскі** сельсавет, у якім аднаасобны сектар займае 71 проц. у агульным плане збожжапаставак. Да 10 кастрычніка план выканан аднаасобнікамі толькі на 30 проц. Упаўнаважаны РК і РВК тав. Мартынаў наведвае сельсавет раз у два тыдні. Сакратар ячэйкі тав. Белаток і старшыня сельсавета Механікаў лібералічаюць з сабатажнікамі збожжапаставак. Члены сельсавета ад вёскі Булыжцы Лаўрэнаў, Палітаў, ушаноўваючыя дзесяцідворак Пашукін, Лаўрэнаў Свірыд, Палітаў Улдзімер не толькі нічога не робяць для ўзмацнення тэмпа паставак, але і самі нічога не здалі.

Такі-ж малюнак у В. Бялевіцкім і Амхаўскім сельсоветах.

Аднаасобнікі Дашкаўскага сельсавета павінны былі здаць у верасні 1.756 цэнтн. збожжа, але да 1-га кастрычніка гэты план выканан усяго толькі на 40 проц.

Спытайцеся сакратара парт'ячэйкі тав. Сагала, як здаюць збожжа аднаасобнікі. Ён вам знойдзе сотні «аб'ектыўных» прычын, каб «растлумачыць», чаму не паступае збожжа, але ні аднаго сабатажніка збожжазда чы назваць не можа. Ён іх проста не ведае. А між тым, толькі ў адной вёсцы Боўшава можна гэтых сабатажнікаў налічыць колькі хочаце. Узяць хоць-бы Сініцына Ігната, які не здаў яшчэ дзяржаве ні аднаго кіло збожжа. Сядзіць сабе Сініцын спакойна і ў вус не дзме, а сельсавет і парт'ячэйка маўчаць.

Такіх фактаў можна шмат прывесці і з Новасельскага, Машанацкага і Гаранскага сельсветаў, дзе з сабатажнікамі цацкаюцца.

Рэзкае змяншэнне тэмпаў збожжаздачы характэрна не толькі для аднаго аднаасобнага сектара, але і для сяго раёна ў цэлым.

Возьмем паступленне за некалькі дзён. 16 і 17 верасня паступіла па раёне 97,5 тоны, 20 верасня — 20 тон, за два дні—22 і 23 верасня—52 тоны. Некаторыя сельсветы—Гаранскі, Новасельскі, Машанацкі, Шчэжарскі зусім спынілі збожжапастаўкі.

Нават сярод лепшых калгасаў ёсць дэмабілізацыя. Укажам, напрыклад, на калгас імя Варашылава, Княжыцкага сельсавета. Гэты калгас з поспехам скончыў уборку і азімую сяўбу і поўнасцю здаў жыта. А далей... стоп. У калгасе рашылі «адпачыць»... Пшаніцы, аўса і бабовых культур калгас яшчэ нічога не здаў, а ячмень—толькі на 40 проц. Між тым, гэтыя культуры ў калгасе ўжо даўно абмалочаны. Не здаюць толькі таму, што ніхто аб гэтым нават і не напамінае.

На працягу апошніх тыдняў, найшоўны па шляху чарговасці—раней адгрузім бульбу Ленінграду, потым забяспечым мясцовы завод «Зара» ільном, а пасля і за збожжапастаўкі ў сур'ёз возьмемся,—райком пусціў збожжапастаўкі на самацёк. РК і РВК, літаральна, нічога канкрэтнага не зрабілі, каб сурова ўдарыць па кулацкім сабатажы збожжапаставак, па канкрэтных вінаватых у зрыве плана, каб разгарнуць сярод калгаснікаў і працоўных аднаасобнікаў шырокую масавую работу. Далей рэзалюцый РК не ідзе. Яшчэ 21-га верасня райком і РВК, патрабуючы ў сваёй пастанове безагаворачнага і поўнага выканання плана, папярэдзілі кіраўнікоў, што «ў выпадку невыканання імі верасневага плана па абавязковай здачы збожжа, праяўлен ня благадушша, ліберальнічання да кулака,—яны будуць прыцягнуты да суровай адказнасці, аж да выключэння з партыі».

Але гэта рэзалюцыя, як і шмат іншых, засталася толькі на паперы. Ні адзін канкрэтны вінаваты, ні адзін сабатажнік збожжапаставак у раёне да адказнасці не прыцягнут. Больш таго, іменна апошняя верасневская дэкада дала ў раёне ганебны правал, ганебны зрыў верасневага плана.

На працягу бліжэйшых дзён у Магілеўскім раёне трэба стварыць рашучы і карэнны пералом. Раённыя арганізацыі маюць усе магчымасці выканаць план. Трэба толькі раз назаўсёды пакончыць з апартуністычным самацёкам. К.

ЭЛЕКТРЫЧНАСЦЬ—КАЛГАСНАЙ ВЁСЦЫ

ЭЛЕКТРАМАЛАЦЬБА Ў КАЛГАСЕ «ПЕРАМОЖАЦ».

ВЫНІКІ СОЦСПАБОРНІЦТВА ПАМІЖ БССР І ЗАХ. ВОБЛАСЦЮ НА 10 КАСТРЫЧНІКА 1933 г

	БССР проц.	ЗАХ. ВОБЛ. проц.
ЗЖАТА ЗБОЖЖАВЫХ	96,0	98,5
УБРАНА З ПОЛЯ	93,9	95,9
АБМАЛОЧАНА ЗБОЖЖАВЫХ	56,1	68,5
РАЗАСЛАНА ІЛЬНА	90,8	98,1
ПАДНЯТА СА СЦЕЛІШЧАЎ	28,7	43,9
АБМАЛОЧАНА ІЛЬНА	95,2	—
ЗАСІЛАСАВАНА	64,8	69,3
ЗАСЕЯНА АЗІМЫХ	95,2	98,6
У ТЫМ ЛІКУ ПШАНІЦЫ	88,7	98,6
ЗАЗЯБЛЕНА	23,6	21,6
ПАДНЯТА ЦАЛІНЫ	29,7	3,2
УБРАНА БУЛЬБЫ	56,6	51,3
АДГРУЖАНА БУЛЬБЫ ЛЕНІНГРАДУ	62,8	46,7
ЗАГАТОЎЛЕНА ІЛЬНАНАСЕННЯ	43,2	60,8
ЗАГАТОЎЛЕНА ВАЛАКНА	4,4	0,9
ГАДАВЫ ПЛАН ЗБОЖЖАПАСТАВАК	66	69,6

Буксірныя брыгады ў Дубровенскім раёне

ОРША (па тэлефону ад наш. кар.). Перадавы па збожжапастаўках Аршанскі раён 11 кастрычніка выслаў 2 буксірныя брыгады ў адстаючы Дубровенскі раён.

Брыгады выехалі з двух перадавых сельсветаў Аршаншчыны —Смалянскага, па чале са старшынёй **Кудзянам**, і Яромніцкага, з сакратаром ячэйкі КП(б)Б **Якушэвічам**.

Брыгады перад выездам узялі на сябе абавязак—узяць на буксір самыя адстаючыя сельсветы Дубровенскага раёна і, шляхам соцспаборніцтва, правядзеннем масавай работы і перадачы вопыта работы сваіх сельсветаў, дабіцца поўнага выканання плана збожжаздачы па Дубровеншчыне.

Не гледзячы на тое, што дубровенскія арганізацыі мала дапамагаюць буксірным брыгадам у іх рабоце, на 14 кастрычніка брыгада пад кіраўніцтвам **Кудзяна** дабілася поўнага выканання збожжапаставак у **Баеўскім** сельсавеце, які ўвесь час быў адстаючым. Брыгада бярэ зараз на буксір другі адстаючы сельсавет. Брыгада **Якушэвіча** дабілася выканання плана збожжапаставак па 50 проц.

УСЕБЕЛАРУСКІ РЭЙД ЦКК і „ЗВЯЗДЫ"

УБОРКА БУЛЬБЫ НЕДАПУШЧАЛЬНА ЗАЦЯГВАЕЦЦА

ДА 10 КАСТРЫЧНІКА ВЫКАПАНА ТОЛЬКІ 56,6 ПРОЦ. ЗАДАННЯ.—КОЖНЫ ПРАТЭРМІНАВАНЫ ДЗЕНЬ ПАГРАЖАЕ ВЯЛІКІМІ СТРАТАМІ

ФІКСАТАРЫ ЗРЫВАЎ

РАГАЧОЎ. Рагачоўшчына — адзін з асноўных бульбяных раёнаў БССР. Масавая ўборка бульбы тут пачалася 15 верасня. Прайшоў амаль месяц. За гэты час раён павінен быў поўнасцю ўжо закончыць уборку бульбы. Між тым, на 10 кастрычніка ўбрана толькі 8.755 гектараў, што складае 67 проц. плошчы, занятай пад бульбу. Калгасы ўбралі толькі 58 проц. бульбы.

Дзе прычыны такога зацягвання ўборкі?

Першая і асноўная—УБОРКА ЎВЕСЬ ЧАС ІДЗЕ САМАЦЁКАМ. Амаль ні ў адным калгасе раёна няма аперацыйнага плана ўборкі, графіка работ, як гэта было прапанавана партыяй і ўрадам. Заданні па ўборцы да пасобных калгасных брыгад не даведзены.

Возьмем калгасы 2-га вытворчага ўчастка МТС. У калгасе «ЧЫРВОНЫ ПРАМЕНЬ» з 22 гектараў ўбрана 6. На ўборку выходзіць не больш 13 чал., якія ўбіраюць па 0,5 га ў дзень. Плана ўборкі ў калгасе няма. Праца зусім не арганізавана. Калгаснікі працуюць усе разам, а аплата падзяляецца пароўну. Калгаснікі не ведаюць, колькі яны атрымаюць за работу на ўборцы, бо ніякіх норм выпрацоўкі і здзельшчыны не ўведзена.

У Калгасе «ЧЫРВОНЫ МІНЬКАЎ» дзве трэці бульбы яшчэ ў зямлі. На ўборку выходзіць нязначная частка калгаснікаў. Тут таксама плана ўборкі і графіка работ няма.

На практыцы гэтых двух калгасаў можна прасачыць, як вытворчы ўчастак МТС (загадчык ПЛІСКОЎ, аграном МАРТЫНКОЎ) кіруе калгаснай вытворчасцю, дапамагае калгасам на гэтым адказнейшым участку. Фактычна ў самы разгар уборкі бульбы 1-шы вытворчы ўчастак МТС замест арганізатара калгаснай вытворчасці, ператварыўся ў фіксатара зрываў работы.

Загадчык участкам Плісноў, член партыі, і агранам Мартынкоў прыяжджаюць у калгасы толькі за вестамі. Запішуць нічбы, пагутарыць, і едуць далей.

У калгасе «Чырвоны Мінькаў» ёсць бульбакапалка, але яна спакойна ляжыць пад павецью, у той час, як уборка бульбы зрываецца.

На пытанне, чаму не выкарыстоўваецца бульбакапалка, старшыня калгаса, кандыдат партыі Зеляной адказвае, што для бульбакапалкі патрэбны 4 кані, а яны заняты на зяблеве.

Калі-ж вытворчы ўчастак прапанаваў калгасу трактар для падняцця зяблева з тым, каб вызваленых коняй перакінуць на бульбу, Зеляной катэгарычна адмовіўся. Тут сказалася кулацкае супраціўленне машынізацыі сельскай гаспадаркі. Вытворчы ўчастак МТС на гэты факт зусім не рэагаваў. Бульбакапалка, як і раней, стаіць, а ўборка зацягваецца.

Характэрна, што супраціўленне механізацыі ўборкі бульбы наглядаецца не толькі ў гэтым калгасе. У раёне ёсць звыш 100 бульбакапалак. Скарыстоўваюцца-ж толькі адзінкі. Пераважная частка бульбакапалак ляжыць у гумнах, пад павецямі. Такія факты наглядаюцца ў калгасе «Ленінскае жыццё», «Ніва Кастрычніка», «Інтэрнацыянал» і інш.

Чаму-ж не скарыстоўваюцца бульбакапалкі? Можа яны не падыходзяць да ўмоў Рагачоўшчыны? Нічога падобнага. У калгасе «Авангард» бульбакапалка працуе вельмі добра, і ўбірае за дзень паўтара га.

У большасці калгасаў раёна не ведаюць, як трэба абыходзіцца з бульбакапалкай, як яе адрэгуляваць і пусціць у ход. Не ведаюць не толькі радавыя калгаснікі, але і многія аграномы і загадчыкі вытворчых участкаў. У калгасах 2-га вытворчага ўчастка МТС (загадчык РАДЧАНКА, агранам СТРАНЧАНКА) ёсць 14 бульбакапалак. Але ні адна з іх не працуе.

Капя 10-ці бульбакапалак яшчэ ляжыць на складзе Сельгасснаба. У той-жа час у радзе сельсветаў (Кісцянеўскі, Мадорскі) уборка бульбы робіцца старадаўнім спосабам — матыкамі і кланіцамі.

Паданыя факты з усёй наглядасцю паказваюць, што ўборкай бульбы раённыя партыйныя і совецкія арганізацыі не кіруюць.

Далейшая зацяжка ўборкі бульбы да самых замарозкаў, самацёк у арганізацыі работы на палях пагражае Рагачоўшчыне вялікімі стратамі.

Брыгада «Звязды» —

ЗОРЫН, ВЯРХОЎСКІ.

Ход уборкі бульбы

(у гектарах, на 10 кастрычніка)

План	Убрана	Проц. выканання	Рост за пяцідзеўку
611.765	346.472	56,6	16

Ход адгрузкі бульбы Ленінграду

(На 14 кастрычніка ў тонах)

Назва арганізацыі	Гадавы план	Адгружана: За дзень	Адгружана: З пачатку кампаніі	Процант
Белкаапгародніна . . .	157.270	5.745	107.002	68,0
Белплодагародніна . .	113.000	1.803	70.346	62,3
РАЗАМ:	270.270	7.548	177.348	65,6

Уборка па кулацку

РЭЧЫЦА. (Наш кар.). Райком паслаў нядаўна ў сельсветы партарганізатараў для кіраўніцтва і дапамогі ва ўборцы і здачы бульбы дзяржаве. Аднак, райком не наладзіў праверкі работы ўпаўнаважаных.

Як-жа яны працуюць? Вось прыклад дзейнасці партарганізатара ў Падалескім сельсавеце тав. **Цогліна.** Прасядзеў ён у сельсавеце больш за тыдзень і вярнуўся ў горад, а бульба не ўбіраецца і на пункты не паступае. На дапамогу Цогліну РК паслаў яшчэ аднаго ўпаўнаважанага—начальніка аддзела сувязі т. Ляпіча. Вынікі тыя-ж. Адзін нічога не рабіў і другі сядзеў, склаўшы рукі.

Ёсць і такія арганізатары, якія тыдзень не паказваліся ў калгасах. Тав. Пікус, прымацаваны да калгаса «Чырвоны сцяг», Артукоўскага сельсавета, ні разу не быў у калгасе.

У калгасе «Беларусь», Свірыдавіцкага сельсавета, уборка бульбы зрываецца таму, што калгаснікі на чале з старшынёю маюць па некалькі га касеваў уласнай бульбы і заняты цэлы дзень на сваіх гародах, «Раней убяром сваю бульбу, а потым калгасную». Партарганізатар яшчэ не выехаў з горада і не ведае, што ро-

У с.-г. арцелі імя Сталіна, Васілевіцкага сельсавета, выкапана толькі 15 га бульбы, засталося яшчэ 75. Замест 300 калгаснік на работу выходзяць 40-45, рэшта заняты на сваіх сядзібах. Здзельшчына зусім не праводзіцца.

Зусім зразумела, што дрэннае становішча з уборкай тармозіць пастаўкі. Сямёнаўскі, Ліскаўскі, Гавенавіцкі сельсветы яшчэ не пачыналі здачу прадукцыі.

Ніякага парадку няма па прыёмачных пунктах. Белплодагародніна сустрэла кампанію непадрыхтаванай. Нахаўскі пункт тыднямі не разлічваецца з сялянамі, няма квіткоў. Замест квіткоў выдаюць здатчыкам абрыўкі паперы, такіх паперак выдана на 660 руб. Бульба вельмі агідна ахоўваецца на пункце. 8 вагонаў бульбы ляжаць больш за тыдзень непрыкрытымі. На раз'ездзе Бабічы пад адкрытым небам скапілася каля 60 тон.

Пералічаныя факты сведчаць, што рачыцкія арганізацыі не мабілізаваны на своячасовую ўборку і здачу добраякаснай бульбы.

ПЕРАВЫКАНАЛІ ПЛАН АДГРУЗКІ

СЯННО. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). ПЛАН АДГРУЗКІ БУЛЬБЫ ЛЕНІНГРАДУ І РАЗМЕРЫ 2.600 ТОН ВЫКАНАН.

РК—ЛЕНЦНЕР.

УШАЧЫ. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). РАЁН ДА ТЭРМІНА ВЫКАНАЎ ЗАДАНЬНЕ ПА АДГРУЗЦЫ БУЛЬБЫ. ПА ПЛАНУ ТРЭБА БЫЛО АДГРУЗІЦЬ 1.800 ТОН НА 12 КАСТРЫЧНІКА АДГРУЖАНА 1.864 — 103,5 ПРОЦ. ПЛАНА. НЕ РАКЛЮЧЫЛІСЯ НА АДГРУЗКУ ІНШЫМ ГАРАДАМ.

РК—ТАРАСЕВІЧ, РВК—ЛЯСОВІЧ.

АСВЕЯ. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). 12 КАСТРЫЧНІКА РАЁН СКОНЧЫЎ АДГРУЗКУ БУЛЬБЫ ЛЕНІНГРАДУ.

СЦЕФАНОВІЧ.

ДРЫСА. (ПА ТЭЛЕГРАФУ). ЗАДАННЕ ДАЦЬ ЛЕНІНГРАДУ 2.900 ТОН БУЛЬБЫ ВЫКАНАНА. ДА 13 КАСТРЫЧНІКА АДГРУЖАНА 3.150 ТОН.

БУРАЧЭЎСКІ, АНТОНАЎ.

Ноч у пошуках прыёмшчыка

ЛЕПЕЛЬ. Толькі 20 верасня раённыя арганізацыі заняліся бульбапастаўкамі. Таму кампанія разгортваецца недапушчальна павольна. Адкрыццё прыёмачнага пункта на ст. Лепель не забяспечвае хуткай адгрузкі. Не хапае 4-х прыёмшчыкаў. Няма скрынь для ссыпкі прадукцыі. Склад не змяшчае нават сутаннага паступлення. Ніякай увагі не аддаецца якасці прадукцыі — трапляецца дробная, пашкоджаная бульба.

Ушацкая база Белплодагародніны на ст. Лепель (загадчык **Лабана**) на працягу двух дзён не разлічвалася з здатчыкамі. Быў выпадак, калі калгаснікі цэлую ноч шукалі прыёмшчыка. На пункце толькі адна вага, з прычыны чаго стварацца вялікія чаргі. Падвязныя шляхі не адрамантаваны, копі празнуць.

Нядаўна дзяжурны па ст. Лепель **Калішэвіч** падаў адзін вагон без люка і адзін з-пад газы. Дзяжурны **Белеў** падаў вагоны з-пад соді і з-

Ноч у пошуках прыёмшчыка

ЛЕПЕЛЬ. Толькі 20 верасня раённыя арганізацыі заняліся бульбапастаўкамі. Таму кампанія разгортваецца недапушчальна павольна. Адкрыццё прыёмачнага пункта на ст. Лепель не забяспечвае хуткай адгрузкі. Не хапае 4-х прыёмшчыкаў. Няма скрынь для ссыпкі прадукцыі. Склад не змяшчае нават сутаннага паступлення. Ніякай увагі не аддаецца якасці пр

ПАРТЫИНАЕ БУДАЎНІЦТВА

ЗА ВЫСОКУЮ ЯКАСЦЬ МАРКСІЦКА-ЛЕНІНСКАЙ ВУЧОБЫ

ДРЭННА РЭАЛІЗУЮЦЦА ЎКАЗАННІ ПРАВЕРКОМА

Партыйная арганізацыя **магілеўскай** швейнай фабрыкі імя Валадарскага—адна з самых маладых у горадзе. У яе склад уваходзіць больш 100 членаў і кандыдатаў КП(б)Б, большая частка якіх уступіла ў партыю ў 1931-32 г. г.

Ніякі палітычны ўзровень партыйцаў, палітычная непісьменнасць іх—вось што выявіла чыстка партарганізацыі. Камісія па чыстцы пераявіла з членаў КП(б)Б у кандыдаты 12 чалавек, з кандыдатаў у спачуваючыя — 13.

Адна з асноўных прычын гэтага—зусім слаба арганізаванае марксіцка-ленінскае выхаванне партыйнаў. Партыйная вучоба ў мінулым навучальным годзе была нездавальняючай. Гэта абавязвае бюро парткалектыва фабрыкі ў сёлетнім годзе звярнуць самую сур'ёзную ўвагу на партыйную вучобу, па-большэвіцку ажыццявіць прапановы камісіі па чыстцы, у сваіх выступах адзначыўшай: «паставіць, як важнейшую задачу партарганізацыі, марксіцка-ленінскае выхаванне членаў і кандыдатаў КП(б)Б, спачуваючых і комсамольцаў, дабіўшыся 100-процантнага ахопа іх партвучобай».

Як-жа парткалектыў рэалізуе гэтыя ўказанні?

Бюро калектыва заслухала даклады сакратароў цэхавых партыйных і комсамольскіх ячэек аб зімовай партвучобе. Гэта пытанне абгаварыў і партыйны сход.

На фабрыцы арганізавана саўпартшкола і кандыдацкая школа, якія займаюцца ў дзве змены. Апрача гэтага 20 комуністаў накіраваны ў вячэрнюю саўпартшколу (сярод іх 5 комсамольцаў), 12 у камвуз.

У фабрычнай кандыдацкай школе і саўпартшколе заняткі павінны праводзіцца 12 раз у месяц. У вучэбных планах уведзены беларуская мова і матэматыка, а таксама спецпрадметы па вывучэнні вытворчасці фабрыкі.

Для кандыдацкай школы набыта 70 экземпляраў кніжкі па палітграмаце т. Кнугулава. Кіраўнік школы **Шчэрба** акуратна з'яўляецца і добра праводзіць заняткі.

Зусім іншае ў саўпартшколе. Да гэтага часу няма выкладчыка па гісторыі партыі. Школа займаецца тэлькі па агульнаадукацыйных дысцыплінах. Ёсць толькі 4 экз. падручнікаў па гісторыі партыі.

Але бюро парткалектыва яшчэ далёка не ўсё зрабіла для сапраўды шырокага разгортвання марксіцка-ленінскага выхавання. 12 слухачоў у кандыдацкай школе, 18—у саўпартшколе. Гэта зусім нязначныя лічбы. Мала зроблена для ўцягнення ў вучобу беспартыйных рабочых-ударнікаў. З 1.400 рабочых фабрыкі толькі некалькі дзесяткаў наведваюць фабрычную партыйную школу.

Нічога не робіцца для падрыхтоўкі на фабрыцы кадраў прапагандыстаў.

З наведваннем школ таксама не ўсё добра. Некаторыя партыйцы (Флеер, Верын), пераведзеныя ў кандыдаты, сабатуюць вучобу.

Усе гэтыя недахопы толькі 8 кастрычніка былі абгаворваны бюро парткалектыва.

Зусім дрэнна пастаўлена комсамольская вучоба. На фабрыцы 140 комсамольцаў, сярод іх 30 навічкоў. Некалькі комсамольцаў займаюцца ў рабфаках і ў вячэрняй рабочай школе, частка комсамольцаў—членаў і кандыдатаў КП(б)Б, наведваюць саўпартшколу. Але асноўная маса комсамольцаў палітвучобай не ахоплена.

Прапановы камісіі па чыстцы на фабрыцы яшчэ дрэнна ажыццяўляюцца.

Н.

Гарком павінен арганізаваць вучобу

У пастанове бюро **Віцебскага** гаркома партыі запісана: «Распачаць партыйную вучобу па горадзе не пазней 15 верасня». Як-жа рэалізуецца гэта пастанова? Ці зматаюцца сапраўды па-большэвіцку кожны картыйны калектыў і ячэйка за лепшую арганізацыю марксіцка-ленінскага выхавання на сваім прадпрыемстве?

З усёй рэзкасцю падкрэслім, што дагэтуль на значнай частцы прадпрыемстваў горада гэтай барацьбы яшчэ няма. Асаблівa дрэнна стаіць справа на такіх буйных фабрыках, як **«Сцяг індустрыялізацыі»**, **«Прафінтэрн»**, **махорачная, завод «Чырвоны металіст»**, **шчотачны камбінат** і інш. На гэтых прадпрыемствах да 26 верасня заняткі ў сетцы партыйнай вучобы яшчэ не пачыналіся.

Дзе прычыны? Кіраўнікі партыйных калектываў гэтых прадпрыемстваў тлумачаць прычыны так: «Нема падручнікаў, не набыты сшыткі, не падпісаны памяшканні, не вылучаны прапагандысты». Але ці-ж не самі кіраўнікі вінаваты ў гэтым? Непадрыхтаваліся да партыйнай вучобы нельга інакш вытлумачыць як анархаўнаўстычнай недаацэнкай марксіцкага выхавання.

Там, дзе па-ўдарнаму была разгорнута падрыхтоўчая работа і створаны належныя ўмовы для вучобы, навучальны год пачаўся своечасова. Так, на фабрыцы «КІМ» і памяшканне ёсць, і падручнікамі школа забяспечана, і прапагандыстаў хапае. Яшчэ 3 верасня на фабрыцы быў праведзен арганізацыйны сход. Усе комуністы і спачуваючыя ахоплены марксіцка-ленінскім выхаваннем. Каля 50 проц. слухачоў школы і гурткоў—беспартыйны актыў—рабочыя і работніцы.

Добра падрыхтаваліся да партыйнай вучобы таксама чыгуначнікі. Філіялам комвуза на вузле ахоплена вучобай 120 чалавек партыйнага актыва, арганізаваны 4 саўпартшколы: кры службе цягі, руху, эксплаатацыі і пажарнай камандзе, з пазмеснай работай.

Партыйная вучоба **на вузле** пачала ся з правядзення адзінага мясавага палітдня 17 верасня. Да гэтага дня рыхтаваліся ўсе рабочыя. Па цэхах былі выпушчаны спецыяльныя насценгазеты, праведзены гутаркі аб марксіцка-ленінскай вучобе. Палітаддзел у паўночна-заходнім дэпо выклікаў вялікую цікавасць і цягу рабочых да партыйнай вучобы. Старыя рабочыя-партыйцы Багданаў, Пятроў і Кушневіч абвясцілі сябе ўдарнікамі палітвучобы.

Асаблівая ўвага пытанням партыйнай вучобы аддаецца палітаддзелам вузла. 19 верасня палітаддзел правёў спецыяльную нараду ўсіх сакратароў і прапагандыстаў ячэек вузла, на якой пачаў палітаддзела тав. **Васількоўскі** патрабаваў ад усіх ячэек большай дбайнасці і ўвагі да марксіцка-ленінскага выхавання.

Большасць парткалектываў і ячэек Віцебска, прапоўных чыстак партыі, не разгарнулі яшчэ работы з гаварышамі, пераведзенымі ў кандыдаты і спачуваючыя. Гарком партыі разам з гаркомам комсамола намецілі 23 верасня правесці адзіны мясавы вечар, прысвечаны асенне-зімовай партыйнай вучобе. На гэты вечар з'явіліся прэзідыі культпропы і прапагандысты. З большасці прадпрыемстваў нават сакратары парт'ячэек на вечар не з'явіліся, і вечар быў сарваны. Калі ячэйкі зараз-жа не прымуць тэрміновых мер, можа быць сарвана ўся партыйная вучоба. К.

ПАЛІТАДДЗЕЛ УЗНАЧАЛІЎ БАРАЦЬБУ ЗА АЎЛАДАННЕ МАРКСІЦКА-ЛЕНІНСКАЙ ТЭОРЫЯЙ

(ГУТАРКА З ІНСТРУКТАРАМ ПАЛІТАДДЗЕЛА 6-ГА РАЁНА МБВ ЧЫГУНКІ ПА ДРУКУ, ПРАПАГАНДЗЕ І МАСАВАЙ АГІТАЦЫІ ТАВ. ЛІПНІКАМ).

Падрыхтоўцы да асенне-зімовай партвучобы на Віцебскім чыгуначным вузле палітаддзел аддаваў максімум увагі. У парадку падрыхтоўкі праведзены двухмесячныя курсы рабочых прапагандыстаў з вызваленнем іх ад работы. Падрыхтавалі і перападрыхтавалі 17 чалавек, якія зараз прымацаваны да кіраўніцтва кандыдацкай сеткі.

Партыйная вучоба на вузле пачалася з правядзення адзінага мясавага палітдня 13 верасня, на якім стаяла пытанне аб марксіцка-ленінскім выхаванні. Да гэтага дня падрыхтаваліся ўсе рабочыя, цэхі і брыгады. У цэхах былі выпушчаны спецыяльныя насценгазеты. Праводзіліся гутаркі з рабочымі аб марксіцка-ленінскай асвеце, развешаліся лозунгі і г. д. Палітмасавы дзень па партасвеце, праведзены ў паўночна-заходнім дэпо, выклікаў вялікую зацікаўленасць і цягу рабочых да партыйнай вучобы. Старыя рабочыя партыйцы Багданаў, Пятроў, Кушневіч абвясцілі сябе ўдарнікамі палітвучобы.

Асаблівая ўвага пытанням партыйнай вучобы аддаецца палітаддзелам вузла. 19 верасня палітаддзел правёў спецыяльную нараду ўсіх сакратароў і прапагандыстаў ячэек вузла, на якой пачаў палітаддзела тав. **Васількоўскі** патрабаваў ад усіх ячэек большай дбайнасці і ўвагі да марксіцка-ленінскага выхавання.

Большасць парткалектываў і ячэек Віцебска, прапоўных чыстак партыі, не разгарнулі яшчэ работы з гаварышамі, пераведзенымі ў кандыдаты і спачуваючыя. Гарком партыі разам з гаркомам комсамола намецілі 23 верасня правесці адзіны мясавы вечар, прысвечаны асенне-зімовай партыйнай вучобе. На гэты вечар з'явіліся прэзідыі культпропы і прапагандысты. З большасці прадпрыемстваў нават сакратары парт'ячэек на вечар не з'явіліся, і вечар быў сарваны. Калі ячэйкі зараз-жа не прымуць тэрміновых мер, можа быць сарвана ўся партыйная вучоба. К.

У ГОРАДЗЕ РАЗГАР, А Ў ВЁСЦЫ...

ПОЛАЦАК. (Ад нашага карэспандэнта). У мінулым годзе ў Полацкім раёне партыйная вучоба была правалена, бо падрыхтоўку да вучобы пачалі тады, калі ўжо трэба было пачынаць заняткі.

У гэтым годзе да палітвучобы пачалі рыхтавацца два месяцы таму назад. Культпроп райкома КП(б)Б склаў калкрэтны план партсеткі па горадзе і па вёсцы і разаслаў яго ячэйкам і калектывам. На мясцах выдучылі прапагандыстаў і правялі спецыяльныя курсы для іх.

Зараз партыйная вучоба па горадзе ў поўным разгары. Створан камбінат з 35 кандыдацкіх груп, групы спачуваючых, камвуз з комсамольскім аддзяленнем пры ім і г. д. Цяга да вучобы вялікая, асабліва зараз, пасля чысткі. Усе групы маюць праграмы і забяспечаны выкладчыкамі. На курсах спачуваючых праходзяць статут і праграму партыі, у кандыдацкіх групах вывучаюць арганізацыйную пабудову партыі, значэнне палітаддзелаў МТС і г. д., таксама матэматыку і беларускую мову. Шырока разгорнута соцэкаборніцтва і ўдарніцтва паміж групамі, выкладчыкамі і студэнтамі. Партвучоба ахапіла больш 500 членаў і кандыдатаў партыі горада.

Горш справа з комсамольскім аддзяленнем комвуза. Укамплектаванне яго зрываецца. Райком комсамола апусціў рукі і не ведае, што прадпрыняць.

На вёсцы становішча партвучобы яшчэ горшае. Таму, не аслабляючы ўвагі да партыйнай і комсамольскай вучобы ў горадзе, зараз неабходна асабліва сурёзна заняцца арганізацыяй вучобы на вёсцы.

Л. Фрыд.

ПАСТАНОВА РЭСПУБЛІКАНСКАЙ КАМІСІІ ПА ЧЫСТЦЫ КП(б)Б

1. Назначыць раённыя камісіі па чыстцы **церахаўскай і лепьчыцкай** парт арганізацый у складзе наступных т. т.

Церахаўскай: старшыня — т. НАРЫН Н. Я., член партыі з 1919 г., самаходчык-рыбак, камандзір батарэі.

Члены: т. **ТАУБЕ Я. Г.**, член партыі з 1917 г., рабочы, машыніст, кантралёр дэпо-Гомель;

Тав. **СЦЕФАНОВІЧ**, член партыі з 1921 г., рабочы, старшыня Церахаўскай РКК КП(б)Б.

Лепьчыцкай:

Старшыня — т. ЖМЫРКО І. Ф., член партыі з 1919 года, рабочы, член парткалегіі ЦКК КП(б)Б.

Члены: т. **ШУНЕЙКО П. А.**, член партыі з 1924 года, рабочы столяр ст. Менск.

2. З прычыны немагчымасці ў гэты момант прыцягнуць да работы па чыстцы т. **Ефімаве**, працоўчага слесарам на ст. Мазыр, — членам раённай камісіі па чыстцы брагінскай партарганізацыі назначыць тав. **Гутнікаву М. Д.**, член партыі з 1924 года, работніца, член прапаргуны ЦК КП(б)Б.

3. Назначыць членам раённай камісіі па чыстцы петрыкоўскай партарганізацыі т. **Шылкова А. М.**, член партыі з 1919 года, служачы, інспектар Упаўнаркамшляхоў па БССР.

4. Членам раённай камісіі па чыстцы рагачоўскай партарганізацыі, замест т. **Гінзбурга** назначыць т. **Крайко Н. Л.**, член партыі з 1924 года, рабочы, нач. пункта ПВА завода імя Варашылава.

5. У сувязі з назначэннем т. **Крайко Н. Л.** членам рагачоўскай райкамісіі па чыстцы, зацвердзіць членам раённай камісіі па чыстцы сешненскай партарганізацыі т. **Казальчыка**, член партыі з 1919 года, слухачы, інспектар віцебскага аддзялення Дзяржбанка.

6. Членам раённай камісіі па чыстцы клімавіцкай партарганізацыі назначыць т. **Львовіч Б. А.**, член партыі з 1923 года, работніца, адказны сакратар парт'ячэйкі завода «Чырвоны золак»—Менск.

7. Членам любаньскай райкамісіі па чыстцы назначыць т. **Вайнера М. Х.**, член партыі з 1924 года, рабочы, заг. аргаддзелам любаньскага РК КП(б)Б.

8. Назначыць членамі раённай камісіі па чыстцы слуцкай партарганізацыі наступных т. т.

Патоцкага Д. С., член партыі з 1919 года, рабочы, дырэктар барысаўскай друкарні; **Матвеенка В. Л.**, член партыі з 1920 года, рабочы, нач. бюяўога забеспячэння кав. палка.

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б.

РАЗГАРНУЦЬ КОМСАМОЛЬСКУЮ ПАЛІТВУЧОБУ

Палітыка-выхаваўчая работа — самае вужкае месца ў комсамоле. Аб гэтым сведчаць вынікі леташняй палітвучобы. У пачатку навучальнага года быў амаль стопроцантны ахоп членаў ЛКСМВ школамі, гурткамі і г. д. З 3.513 комсамольцаў Магілеўскага раёна палітвучобай было ахоплена 2.692 чал. Па **Асіпавіцкім** раёне з 558—512 чал., па **Смалявіцкім** з 589—400 чал. Зусім іншы малюнак быў у сярэдзіне і асабліва ў канцы навучальнага года. Наведванне рэзка знізілася, а ў многіх гуртках і школах вучоба зусім спынілася. У **Рэчыцкім** раёне з існуючых 62 калгасных комсамольскіх ячэек вучоба на працягу года была больш менш наладжана толькі ў 6-7 ячэйках, у астатніх была поўнасцю пракалена.

Такое-ж становішча стварылася і ў гарадскіх комсамольскіх арганізацыях. На **камбінаце «Х-ты Кастрычнік»** было 180 комсамольцаў, а вучобай ахапілі ўсяго 40 чалавек, наведвала-ж заняткі спачатку 25, потым 15, 7 і нарэшце вучоба зусім спынілася. Такія факты можна прыцесці дзесяткамі.

Асаблівa недапушчальным з'яўляецца тое, што значная частка кіруючага комсамольскага актыва палітычна зусім неінфармавана. Сакратар **Полацкага** РК ЛКСМВ тав. **Шыло** быў занят з работы за палітычную неінфармаванасць. Загадчык **Сенненскага** культпропа РК ЛКСМВ т. **Раманенка** не разбіраўся нават у элементарных палітычных пытаннях. Некажэрнасць кіраўніцтва ячэйкамі, адсутнасць палітычных пытанняў у ходзе вучобы—асноўныя прычыны зрыва палітвучобы ў мінулым годзе і летам гэтага года.

Якасць работы школ і гурткоў была зусім нізкая. Заняткі праходзілі оўха, вяла. Гэта знізвала інтарэс да вучобы і выклікала цікучасць сялода школ.

Важнейшым звяном у справе павышэння якасці вучобы з'яўляецца падрыхтоўка моцных прапагандысцкіх кадраў. У бягучым навучальным годзе прапагандыст павінен быць зусім не такі, як да гэтага часу. Прапагандыст павінен быць непасрэдна з вытворчасці, ён ведаць на практыцы і ў такім становішчы. Нельга мірыцца з тым, калі часам райкомы комсамола і чам, калі часам раённыя комсамола і палітаддзелы МТС не ведаюць прапагандыстаў. Дасканалы падбор рабочага-прапагандыста забяспечыць яшчэ большую ўвязку тэарэтычнай вучобы з практыкай нашага будаўніцтва. Неабходна дабіцца, каб прапагандыст прадаваў з комсамольцамі не толькі ў часе заняткаў, але і ўвесь час непасрэдна на вытворчасці. Трэба, каб прапагандыст ведаў, што з сябе прадстаўляе той або іншы комсамолец, той або іншы слухач яго гуртка, ці школы. Прапагандыст павінен арганізоўваць комсамольцаў-слухачоў школ і гурткоў на выкананне вытворчых планаў.

Ні на мінуту нельга забываць і аб вучобе самога прапагандыста. Адной з асноўных форм гэтай вучобы павінны быць семінары прапагандыстаў па вузлових тэмах праграмы.

У гэту ж ліку галоўную ўвагу займае арганізацыя палітвучобы на вёсцы. Задача ўмацнення арганізуючай ролі комсамола на вёсцы ўпіраецца ў ніякі палітычны ўзровень. Гэты год павінен стаць годам бесперапыннай штодзённай большэвіцкай барацьбы за павышэнне ідэйна-палітычнага ўзроўня комсамольцаў. Арганізацыя палітаддзелаў МТС стварае новыя ўмовы для разгортвання марксіцка-ленінскай вучобы. Іх дапамога ў гэтым напрамку асабліва неабходна і бясспрэчна дасць значныя вынікі. Вялікую ролю павінны адыграць таксама таварышы, пасланыя на вёску ў лік «600».

Уся палітыка-выхаваўчая работа ў комсамоле павінна разгортвацца перш за ўсё ў напрамку вывучання гісторыі партыі. Бо «няма лепшага вопыта, няма лепшай зброі выхавання нашай моладзі ў духу марксізма-ленінізма, чым гісторыя нашай партыі» (Кагановіч). Асноўная форма палітвучобы—гэта першапачатковая палітшкола, якая арганізуецца непасрэдна на прадпрыемстве ці ў калгасе з комсамольцаў, не маючых элементарнай палітычнай падрыхтоўкі. Другая форма—курсы па вывучэнні гісторыі УсесКП(б) для комсамольцаў, маючых палітычную падрыхтоўку ў аб'ёме пачатковай палітшколы. Для актыву арганізуюцца гурткі па вывучэнні ленінізма. У горадзе трэба шырока разгарнуць перападрыхтоўку і павышэнне марксіцка-ленінскага ўзроўня сакратароў і культпропаў вытворчых калектываў і аднаек праз спецыяльныя аддзяленні вячэрніх комвузаў і інш. Неабходна таксама шырока скарыстаць заходнюю таксама шырока скарыстаць заходнюю форму палітвучобы, у першую чаргу для комсамольцаў-адзіночак у калгасах.

Усе пастаўленыя задачы могуць быць паспяхова выкананы толькі пад непасрэдным кіраўніцтвам партыйных арганізацый на мясцах. Мы ведаем, якое вялікае значэнне надаваў комсамольскай палітвучобе **Ленін**, якую ўвагу на гэта зараз зварачаюць т. т. **Сталін, Кагановіч, Постышаў.** У іх выступленнях аб комсамоле ўсюды мы знойдзем асаблівую запострэнасць на пытаннях, звязаных з марксіцка-ленінскай вучобай, з павышэннем тэарэтычнага ўзроўня комсамольскіх мас. Адзнак многія мясцовыя партыйныя арганізацыі недаацэньваюць усю велізарную значымасць гэтага пытання.

Комсамольскія арганізацыі павінны больш рашуча ставіць пытанні перад партыйнымі арганізацыямі на мясцах аб дапамозе ў разгортванні і наладжанні палітвучобы. Пытанні падбора і вылучэння прапагандысцкіх кадраў, перазнесенне арганізацыйнага вопыта палітыка-выхаваўчай работы, дапамога метадычным кіраўніцтвам павінны стаяць у цэнтры ўвагі ўсіх партыйных арганізацый.

С. АЖГІРЭЙ.

ЧЫСТКА ПАРТЫІ

Напярэдадні чысткі партарганізацыі цэнтральных газет

11 кастрычніка ў клубе Комасветы адбыўся сход партыйнага і прафесыянальнага актыва цэнтральных газет разам з рабкорамі прадпрыемстваў Менска. Сход быў прысвечан надыходзячай чыстцы партыйных ячэек цэнтральных газет.

Адкрываючы сход, старшыня праверачнай камісіі тав. КАВАЛЬСКІ коратка спыніўся на ролі большэвіцкага друку ў барацьбе за правільнае правядзенне генеральнай лініі партыі і ленінскай нацыянальнай палітыкі на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва. Тов. Кавальскі падкрэсліў, што гэту ролю друк можа ажыццяўляць толькі тады, калі ён будзе цесна звязан з шырокімі масамі і арганізуе вакол сябе армію рабселькораў-ударнікаў.

— Барацьба за чыстату ленінскай нацыянальнай палітыкі, — гаворыць тав. Кавальскі, — адна з важнейшых палітычных задач нашай партыі, а значыцца і большэвіцкага друку. ВА ЎМОВАХ БЕЛАРУСІ. БАРАЦЬБА ЗА ПРАВІЛЬНАЕ ПРАВЯДЗЕННЕ Ў ЖЫЦЦЁ ЛЕНІНСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ ПАЛІТЫКІ НАБЫВАЕ АСАБЛІВА ВАЖНАЕ ЗНАЧЭННЕ. Адсюль задача друку — быць на вышыні гэтай барацьбы, дапамагаючы партыі ўскрываць і да канца разбіваць вялікадзяржаўнікаў, нацыянал-дэмакратаў, бундаўцаў і іншых ворагаў дыктатуры пролетарыята.

Пры праверцы партыйных арганізацый перш за ўсё павінны быць зверну та ўвага на барацьбу газет за генеральную лінію партыі, за ленінскую нацыянальную палітыку.

Другі момант, які таксама павінен з'яўляцца адным з асноўных крытэрыяў пры праверцы—гэта сувязь газеты з масамі, як масавая работа з рабселькорамі. Газета, якая не мае гэтай сувязі, не можа ўзначальваць ініцыяты вы мас і мабілізоўваць іх на выкананне ўсіх гаспадарча-палітычных задач, што стаяць перад партыяй і краінай у цэлым.

Сваё ўступнае слова тав. Кавальскі закончыў заклікам да рабкораў і ўсіх работнікаў газет прыняць актыўны ўдзел у чыстцы, разгарнуць большэвіцкую крытыку і самакрытыку памылак і недахопаў работы ячэек і газет.

У парадку спрэчак на сходзе выступалі рэдактары ўсіх газет, адзначаючы дасягненні, недахопы і памылкі ў рабоце рэдакцый. Трэба проста сказаць, што выступленчая самакрытыкі ў выступленнях рэдактараў, асабліва газет «ОРКА» і «КАЛГАСНІК БЕЛАРУСІ», не было. Людзі больш гаварылі аб дасягненнях і менш пра памылкі і недахопы.

А гэтых недахопаў даволі многа. Аб іх гаварылі выступаючыя на сходзе рабкоры прадпрыемстваў і самі работнікі газет. Узяць хоць-бы «ЗВЯЗДУ». Заслугі яе перад партыяй у барацьбе за генеральную лінію і ленінскую нацыянальную палітыку вялікарныя. Аўтарытэт сярод шырокіх працоўных мас вялікі. Але разам з тым яна яшчэ слаба праводзіць масавую работу з рабселькорамі-ударнікамі, мала аказвае дапамогі нізавому фабрычна-заводскаму і калгаснаму друку. Лісты рабочых і калгаснікаў не заўсёды апрымліваюць хуткае рэагаванне. Газета слаба змагаецца за дзейснасць рабселькораўскіх за метак.

Газета «РАБОЧИЙ» слаба праводзіць масавую работу з рабкорамі. Не гледзячы на тое, што яна з'яўляецца рабочай газетай — рабкораўскіх лістоў паступае ў рэдакцыю вельмі мала. Сувязі з нізавым фабрычна-заводскім друкам амаль няма. Замест канкрэтнай дапамогі ў рабоце заводскім шматтыражкам, рэдакцыя скарыстоўвае іх выключна як пастаўшчыка матэрыялаў.

На старонках газеты «Рабочий» часта можна сустрэць сваяасаблівае «ОЧКОВТИРАТЕЛЬСТВО». Не ў тым сэнсе, што няправільна асвятляюцца факты, а ў тым, што аншлагі і «шапкі» прыцягваюцца «за валасы» да матэрыяла. Аншлагі крычаць аб адным, а матэрыялы гавораць пра іншае. Газета недаацэньвае ўсёй палітычнай важнасці кампаніі па зборы сродкаў на пабудову эскадрыльі імя т. КАГАНОВІЧА. Яна ўпарта не друкуе матэрыялаў аб ходзе збора сродкаў.

Яўрэйская газета «АКЦЯБР» праводзіць нядрэнна работу па інтэрнацыянальнаму выхаванню яўрэйскіх працоўных мас. Яна арганізавала і вядзе больш года шэфства рабочых ІЖОРСКА ГА завода над яўрэйскімі нацыянальнымі і інтэрнацыянальнымі калгасамі Беларусі.

Аднак, газета ў сваёй рабоце мала рад буйных палітычных памылак. Асвятляючы факт пасылкі на работу ў «Сыны Беларусі далі сабе забіцца мыслямі аб агульных рабочых тарэсах і зусім забыліся аб сваіх нацыянальных інтарэсах».

Вось гэтыя «сацыялісты» арганізавалі ў Петраградзе свае маленькія групы і ў сярэдзіне лета 1917 года склікалі другую канферэнцыю Грамады. На гэтай канферэнцыі высветлілася, што на сутнасці Грамада прадстаўляе два ідэйна-палітычныя і нацыянальна-нацыянальна-мяшчанскія.

У чэрвені 1917 г. беларускі «нацыянальны камітэт» склікаў другі з'езд беларускіх арганізацый у Менску. На гэтым з'ездзе на патрабаванне [illegible] кай сацыялістычнай грамады была створана ў Менску «Цэнтральная рада ўсіх беларускіх арганізацый і партый». Рада не выдавала. У менскім Совеце Грамада пасля лютаўскай рэвалюцыі не мела ні аднаго прадстаўніка.

Першага мая 1917 года Беларуская сацыялістычная грамада пачала выдаваць у Менску газету пад назвай «Грамада». З першых-жа нумароў газеты стаў ясны яе дробна-буржуазны нацыяналістычны характар; нацыянальныя інтарэсы яна ставіла вышэй класавых. Газета гэта пісала аб Керанскім, як аб «лепшым прадстаўніку народа».

Не знаходзячы слёзы для работы ў самой Беларусі, некаторыя прадстаўнікі Грамады хацелі паставіць работу сярод беларускіх рабочых і сялян, працаваўшых на петраградскіх фабрыках. Аднак, і гэтыя спробы малі нікчэмны поспех, бо беларускія рабочыя і сяляне былі ўцягнуты ў агульны рэвалюцыйны рух і не цікавіліся нацыяналістычнымі пачуццямі беларускай інтэлігенцыі.

У карэспандэнцыі з Петраграда, надрукаванай старшынёй «Сацыялістычнай грамады» Цішкам Гартным (Зм. Жылуновіч) у газеце «Вольная Беларусь», у № 17 ад 1917 года, аўтар скарэніцца:

«Беларускі рух» з першых-жа дзён лютаўскай рэвалюцыі набыў цалкам шавіністычны буржуазны характар. У сакавіку 1917 г. у Менску адбываўся з'езд беларускіх арганізацый, на якім быў створан «Беларускі нацыянальны камітэт». У гэты камітэт увайшлі прадстаўнікі буйных зямлеўласнікаў, буйнай і дробнай буржуазіі, прадстаўнікі Беларускай сацыялістычнай грамады і адзін рабочы — беларускі пісьменнік Жылуновіч. Гэты нацыянальны камітэт зараз-жа выстаўлі патрабаванне перад часовым урадам аб аўтаноміі для Беларусі. Нацыянальны камітэт пачаў выдаваць свой орган «Вольная Беларусь», рэдактарам якога стаў Язэп Лёсік, член Беларускай сацыялістычнай грамады. Газета гэта з самага пачатку стала прыбужай, вакол якой групаваліся усе шавіністычныя элементы.

Адначасова з «Беларускім нацыянальным камітэтам» узаснаваны і Беларуская сацыялістычная грамада. У сакавіку 1917 г. у Менску засядала першая канферэнцыя часовага камітэта беларускіх-сацыялістаў. Канферэнцыя прыняла рэзалюцыю аб падтрымцы часовага ўрада і выказалася за працяг вайны супроць нямецкіх мілітарыстаў.

Беларуская грамада не карысталася, аднак, уплывам на Беларусі. Гэта дробна-буржуазная нацыяналістычная партыя, якая ў 1905-1906 г. г. грунтавала вакол сябе дробныя групы беларускай інтэлігенцыі, мела вельмі мала прыхільнікаў сярод беларускіх сялян і выдала некалькі дзесяткаў праклямацый. Ні газеты, ні брашур Грамада не выдавала. У менскім Совеце Грамада пасля лютаўскай рэвалюцыі не мела ні аднаго прадстаўніка.

Першага мая 1917 года Беларуская сацыялістычная грамада пачала выдаваць у Менску газету пад назвай «Грамада». З першых-жа нумароў газеты стаў ясны яе дробна-буржуазны нацыяналістычны характар; нацыянальныя інтарэсы яна ставіла вышэй класавых. Газета гэта пісала аб Керанскім, як аб «лепшым прадстаўніку народа».

Не знаходзячы слёзы для работы ў самой Беларусі, некаторыя прадстаўнікі Грамады хацелі паставіць работу сярод беларускіх рабочых і сялян, працаваўшых на петраградскіх фабрыках. Аднак, і гэтыя спробы малі нікчэмны поспех, бо беларускія рабочыя і сяляне былі ўцягнуты ў агульны рэвалюцыйны рух і не цікавіліся нацыяналістычнымі пачуццямі беларускай інтэлігенцыі.

У карэспандэнцыі з Петраграда, надрукаванай старшынёй «Сацыялістычнай грамады» Цішкам Гартным (Зм. Жылуновіч) у газеце «Вольная Беларусь», у № 17 ад 1917 года, аўтар скарэніцца:

БІРА-БІДЖАН групы таварышоў, газета падала гэты матэрыял па-абывательску, процінаставіла асоб сутнасці пенінскай нацыянальнай палітыкі. Больш таго. Газета дала няправільную, палітычна шкодную фармулёўку. Аўтаномную яўрэйскую нацыянальную рэспубліку ў Біра-Біджане яна назвала «НАЦЫЯНАЛ-СОЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ».

Газета «КАЛГАСНІК БЕЛАРУСІ» не дрэнна вядзе на сваіх старонках абмен вопытам работы паміж калгасамі БЕЛАРУСІ і ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЦІ; яна перыядычна арганізуе абменныя поласы. Аднак, матэрыял у газеце падаецца павярхоўна, няма глыбокага аналізу работы калгасаў, газета не падымшла яшчэ шчыльна да работы калгасных брыгад.

Сувязь газеты з раёнамі вельмі слабая. Аб гэтым сведчыць факт вярхаглядскага змяшчэння ў газеце адносных матэрыялаў аб Сенненскім раёне, у той час, калі гэты раён са паспяховае правядзенне сяўбы апрымаў пераходны сцяг.

Комсамольская газета «ЧЫРВОНАЯ ЗМЕНА» ў сваёй рабоце яшчэ не ўзяла сапраўднага тона моладзевай газеты. Яна шарахаецца то ў адзін, то ў другі бок. А гэта прыводзіць да таго, што чытач мала знаходзіць у газеце для сябе цікавага матэрыяла. Алгэтуль—зніжэнне тыража газеты і зусім незначнае паступленне ў рэдакцыю лістоў юнкораў.

У сваім выступленні прадстаўнік польскай газеты «Орма» тав. РАДЖЕВІЧ вельмі многа хваліўся заслугамі газеты ў барацьбе з класавым ворагам, які прыкрываецца фальшыва-нацыянальным сцягам, але аб тым, што ў газеце зусім не відаць лістоў рабочых і калгаснікаў, ён нічога не сказаў, абмежаваўшыся агульнай фразай аб тым, што «сувязь з масамі невыстарчальна».

Закрываючы сход тав. Кавальскі [illegible] крэсліў, што крытыка недахопаў [illegible] ты газет, разгорнутая на сходзе, [illegible] на дапаможа камісіі па чыстцы [illegible] рабоце.

Агурскі

НАЦДЭМАУСКАЯ ФАЛЬСІФІКАЦЫЯ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСІ*)

Беларуская сацыялістычная Грамада ў эпоху рэвалюцыі 1905 года з'яўлялася арганізацыяй нацыяналістычна настроенай інтэлігенцыі, стварыўшай тэму арганізацыю для прабуджэння нацыяналістычнага пачуцця ў беларускім народзе. Беларускія рабоча-сялянскія масы, і нават пераважная частка беларускай інтэлігенцыі, як гэта указвае і Турук, і Кастрыч, сталі ў радах «агульнарасійскага вызваленчага руху».

Пасля рэвалюцыі 1905 года дробна-буржуазны і нацыяналістычны характар Грамады яшчэ больш выявіўся. У пачатку 1906 года Грамада пачала выдаваць нацыянальна-рэвалюцыйную газету «Наша доля». Гэта газета была зарыта царскім урадам і на ее месца пачала выходзіць другая «Наша ніва». У перадавой першага нумара гэтай газеты выдаўцы пісалі:

«Не думайце, што мы хочам служыць толькі адным панам або адным мужыкам. Не, ніколі. Мы будзем служыць усяму беларускаму пакрыўджанаму народу, пастараемся быць люстрам жыцця, каб гад нас, як гад люстра, святло падала ў цэмру. Мы будзем старацца, каб усе беларусы, якія не ведаюць, хто яны такія, зразумелі, што яны беларусы і людзі, каб даведаліся аб сваіх правах, дапамагалі нам у нашай рабоце».

Гэта газета не толькі абараняла інтарэсы «свайго беларускага народа». «Наша ніва» была ціхая буржуазная газета, выходзіўшая безупынна ў самыя чорныя гады рэакцыі і прапаведваўшая стальпінскую хутарызацыю Беларусі. Яна лічыла кадэтаў лепшымі прадстаўнікамі дэмакратыі. Вакол гэтай газеты групавалася буржуазная інтэлігенцыя, сярод якой знаходзіўся цяперашні агент дэфензівы Антон Луцкевіч і інш. Гэта газета і прадстаўляла сабою Беларускую сацыялістычную грамаду.

Між тым, апошняя паказваецца беларускімі нацыянал-дэмакратычнымі «гісторыкамі» зусім у іншым святле. Жылуновіч, Вітказўскі і Мялешка ў зборніку праклямацый розных рэвалюцыйных арганізацый Беларусі эпохі 1905 г. прабуюць паказаць яе органам «марксіцкай» і нават «большэвіцкай» партыі, якая, маў, яшчэ ў 1905 г. выкінула лозунг арганізацыі саюза сацыялістычных рэспублік... Вы ўзводзіны да гэтага зборніка Вітказўскі пісаў:

«З праграмы ясна відаць, што БСГ была партыяй з сацыял-дэмакратычнай арыентацыяй». Гэтыя словы выпрацоўваюцца ў камісіі Інбелкульта і гучаць так: «З праграмы ясна відаць, што БСГ была партыяй з нефракцыйнай сацыял-дэмакратычнай арыентацыяй».

Далей мы чытаем у першым твоце: «Гэта адозва ў 1905 годзе зусім ясна падае мысль аб арганізацыі СССР». Гэта знаходзіць сваё выпрацоўванне ў камісіі ІБК такім чынам: «Гэта адозва ў 1905 годзе намякае на будучую, праўда, разумеючы гэта

Усебеларуская пераздкастрычніцкая вытворчая нарада

Словы большэвіка—рэальныя справы

СУСТРЭНЕМ КАСТРЫЧНІЦКІЯ СВЯТЫ ПОЎНЫМ ВЫКАНАННЕМ НАШЫХ САМААБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ

ЯК МЫ ДАБІЛІСЯ ПЕРАМОГ НА СПЛАВЕ

Полацкі сплаўны ўчастак першым у Беларусі закончыў навігацыю 1933 года—на 19 дзён раней устаноўленага тэрміна ўрадам. Да 5 кастрычніка план выкананы на **101 проц.** Сплаўлена да канечных пунктаў прызначэння **89,89** тыс. кбм. будматэрыялаў і **54,32** тыс. кбм. дроў.

Як мы дабіліся гэтых перамог?

Дажкуючы сапраўднаму ажыццяўленню 6-ці гістарычных умоў тав. **Сталіна** і рэалізацыі пастаноў студзеньскага пленума ЦК і ЦКК аб раніе сплаўнога сезона—у аснову пакладзены вышэйшыя формы і метады работы (соцыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва). Ахоплена соцспаборніцтвам і ўдарніцтвам 18 працуючых на сплаве брыгад, або **309** чалавек.

Умовы ўсесаюзнага конкурса спаборніцтва, якія абвешчаны ЦК саюза лесапляўрабочых і рэдакцыяй газеты **«Лясная прамысловасць»** яшчэ больш узялі актыўнасць сплаўшчыкоў. У адказ на гэты конкурс сплаўшчыкі ўзялі на сябе цэлы рад канкрэтных, практычных мерапрыемстваў. У штодзённай рабоце кравяраліся на хаду ўзятыя абавязацельствы, і своячасова знішчаліся недахопы.

Вось некалькі характэрных прыкладаў работы ўдарных брыгад.

Лепшая брыгада сплаўнога ўчастка **Туфара** Івана заключыла соцыялістычны дагавор з брыгадай **Крымскага.** Абедзве брыгады працуюць на малевом сплаве рэкі Ушачы. Работа брыгады была вельмі дрэнная. Сістэматычныя спазненні на работу, прагулы, аварыі, расхлябанасць працоўнай дысцыпліны, невыкананне распараджэнняў брыгадзіра—вось характэрныя рысы былой работы брыгады.

Зрэдна сондагавора брыгадзір Туфар абавязаўся на работу прыходзіць раней за ўсіх, не ўтапіць ні аднаго бервяна. Такія-ж абавязацельствы ўзялі на сябе і цэлы рад іншых ударнікаў-сплаўшчыкаў. Умацаванне працоўнай дысцыпліны спрыяе разгортванню масавай работы. Вось сплаўшчык **Урбан,** брыгады Крымскага. Ён абвясціў сябе ўдарнікам, і на заўтра-ж спазніўся на работу на паўгадзіны. Тут-жа на месцы склікаецца вытворчая нарада, дзе пастанаўляюць вывесіць Урбана на чорную дошку. Праз некалькі дзён рабочы Урбан падае заяву ў брыгаду аб тым, што ён прызнае сваю памылку і просіць знець яго з чорнай дошкі. Брыгада, абмяркоўваючы яго заяву, запрашае на нараду брыгаду Туфара і знімае яго з чорнай дошкі. Пасля гэтага рабочы Урбан не толькі больш не спаздаўся на работу, але пачаў сістэматычна перавыконваць сваё заданне на сплаву, больш рацыянальна выкарыстоўваць свой рабочы час і з поспехам спаборнічае з другім брыгадзірам, Мукатавым.

Вытворчыя нарады, сістэматычная праверка ўзятых на сябе абавязацельстваў, узнясенне розных прапаноў па рацыянальнаму скарыстанню дапаможных матэрыялаў—усё гэта ўвайшло ў сістэму работы сплаўных брыгад.

У брыгадах сістэматычна праводзіліся чыткі сваёй шматтыражкі **«Чырвоны лесаруб»,** раённай газеты і газеты «Лясная прамысловасць». Напярэдадні чыткі спецыяльна вылучаныя людзі вызначаюць, **што** ў першую чаргу чытаць, аб якіх здарэннях і інш. Гэта дало магчымасць знач на ўзняць культурны ўзровень сплаўшчыкаў, мабілізоўваць іх на важнейшыя рашэнні партыі і ўрада па пытаннях сплава.

Былі арганізаваны чырвоныя куткі ў дарозе. Сплаўшчыкі рэгулярна спаб жаліся газетамі і літаратурай. Шматтыражка «Чырвоны лесаруб» не раз арганізоўвала вызыўныя рэдакцыі ў дапамогу выкананню плана на сплаву і разгортванню соцспаборніцтва і ўдарніцтва. Часта практыкавалі пасылку буксірных брыгад, каб забяспечыць выкананне агульнага плана на сплаву. Так, напрыклад, брыгада **Туфара** пасылае буксірных рабочых на раку **Свінка** ў дапамогу ліквідацыі прарыва. У рэзультаце план сплава і тут быў выкананы датэрмінова.

Зараз сплаўны сезон закончыўся перамогай. Разгарнулася работа па падрыхтоўцы да ўсесаюзнага злёта сплаўшчыкаў-ударнікаў і лесарубаў. Асноўныя задачы гэтай падрыхтоўкі —барацьба за лепшае выкананне плана IV квартала, падрыхтоўка да асенне-зімовых лесавывазак, сканчэнне выгрузкі драўніны з рэкі на лесасклавы, барацьба за пераходны сцяг.

У сувязі з гэтым абвешчан унутры сплаўны конкурс паміж брыгадамі і абознікамі. Мэта—да 15 кастрычніка не пакінуць на рацэ ні аднаго бервяна. На ўчастках зараз склікаюцца шырокія вытворчыя канференцыі з удзелам калгасаў і аднаасобнікаў па падрыхтоўцы да зімовых вывазак. Праводзіцца падрыхтоўчая работа да раённага злёта прарабаў, тэхнікаў, культпагледчыкаў па пытанню аб лепшай падрыхтоўцы да злёта і заваявання права ўдзела ў ім.

Газета «Чырвоны лесаруб» абвясціла рэйд на ахіляду гатоўнасці ўчасткаў да зімы і мабілізацыі па гэта нізавога друку. Такі рэйд ужо быў праведзен на **фарынаўскім** участке, які даў станоўчыя вынікі. Праведзена праверка гатоўнасці транспарта, саней, кузняў да зімы.

У сувязі з падрыхтоўкай да злёта, **горанскі** ўчастак абавязаўся да 25 кастрычніка—дня адкрыцця злёта—ліквідаваць прарыў III квартала і выканаць план 4-га квартала на 40 проц.

Калектыўны карэспандэнт газеты «Звязда».

«Чырвоны лесаруб».

Дамо бункерам БелДРЭС'у добраякасны торф

(Ліст рабочых і ІТР Асінторфа)

Таварышы!

Мы ваш ліст шырока абгаварылі ва ўсіх брыгадах рабочых, работнікі і сярод ІТР. Гэты ліст значна дапамог нам узняць на яшчэ больш высокую ступень соцыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва.

Выклікана новая магутная хваля энтузіязма ў барацьбе за сапраўды большэвіцкія тэмпы ў сушцы і ўборцы торфа. І сёння можам вам заявіць, што мы з гонарам справіліся з падняццем са спілкі ўсяго торфа і паваг на прарагу апошняй дэкады, якую мы абвясцілі штурмавой, у адказ на ваш заклік уклалі ў клеткі ўвесь торф, падняты са спілкі. Але гэта яшчэ паўсправы. Каб далкам апраўдаць аказанае нам давер'е, мы павінны дабіцца, каб у бліжайшы час прывезлі ўвесь торф у таварны, гэта значыць добра высушыць і далкам яго заштабеляваць. Да рэалізацыі гэтай рашучай задачы мы зараз пад кі раўніцтвам партыйнай арганізацыі прыступілі. Абяцаем вам, што будзем на працягу ўсяго часу працаваць такімі большэвіцкімі тэмпамі, каб скончыць гэту справу, заштабеляваць увесь торф тэрмінам да 25-X г. г. Мы не забываем і таго, што партыя патрабуе ад нас не толькі колькасці, але і высокай якасці прадукцыі, максімум зніжэння сабекошта. На гэты бок мы звярнулі асаблівую вялікую ўвагу. Мы змагаемся за тое, каб ні адной цэглины не пакінуць на палях спілкі, знішчыць страты і добраякасна заштабеляваць торф, каб здабыты торф быў нарміль на вільготным і высокаякасным апалам для Белдрэс.

Побач з гэтым мы памятаем аб той вялікай задачы, якая стаіць перад намі, гэта—стварыць нармальную і бесперапынную адпрузку торфа для нармальнай работы станцыі і гэтым самым забяспечыць бесперабойную работу вялікай часткі соцыялістычнай прамысловасці Беларусі.

Вы ўказалі нам на цэлы рад недахопаў у нашай рабоце. З усёй большэвіцкай самакрытыкай прызнаем і прымем рашучыя захады па іх знішчэнні. Са свайго боку абавязваемся:

1. Да 25 кастрычніка скончыць поўнасцю штабялёўку торфа.

Штодзённа адпружаць вам поўную колькасць вагонетак торфа, вызначаных планам, і знішчыць капчаткова недапрузку.

Грузіць вам торф лепшай якасці, гэта значыць з найменшай вільготнасцю.

Поўнасцю разгарнуць усе падрыхтоўчыя работы да сезона торфаздабычы 1934 года. Адпачасова мы просім вас, каб вы нам таксама дапамаглі справіцца з гэтымі задачамі. Вельмі ўдячны вам за дапамогу ў часе сушкі, але памамінаем, што вы ўзятага на сябе абавязка аб дапамозе нам трыма тысячамі чалавека-дзён яшчэ не выканалі. Зараз, у часе штабялёўкі, мы маем патрэбу ў дапамозе нам фізічнай сілай больш як калі. Яшчэ дагэтуль не зроблен вамі шлях на паўночны масіў, не гледзячы на тое, што канчатковы тэрмін быў 1-га кастрычніка. Гэта можа выклікаць перабої ў пагрузцы торфа.

Вельмі дрэнна працуе ваш транспарт. Частыя спазненні паездоў, што выклікае прастоі рабочых, выклікія страты торфа ў дарозе з-за няспраўнасці вагонаў,—усё гэта з'яўляецца бічом для нармальнай работы станцыі. Гэта трэба рашуча і найхутчэй знішчыць.

У нас яшчэ вельмі слабая працоўная дысцыпліна. Лодырніцтва і лятушэства таксама яшчэ не зжыты. Вы зусім правільна ўказалі, што гэта зло значна паншкодзіла правядзенню сезона торфаздабычы. Таму мы, рабочыя і ІТР Асінторфа, вусцамі сваіх лепшых рабочых-ударнікаў, сабраўшыхся сёння на V заводскую канферэнцыю ўдарнікаў, заяўляем, што наяўныя ў нас недахопы знішчым і пастаўленыя перад намі партыяй задачы з гонарам выканаем. Перад вамі, рабочыя Белдрэс, у даўгу не застанемся. Прыдзем да кастрычніцкіх свят з новымі перамогамі ў барацьбе за торф.

V канферэнцыя ўдарнікаў.

Тав. ПЯЦІН—ударнік фаб. «За 1-ю 5-ку».

Тав. СТАЎСКІ—ударнік якасці зав. «Чырвоны барацьбіт».

ПАХОД ЗА ВЫСОКАЯКАСНУЮ ЖЫВЁЛАГАДОЎЛЮ

Зробім жывёлагадоўчыя саўгасы перадавымі, узорнымі гаспадаркамі

Не рыхтуюцца да зімы

Усебеларускі паход за высокаякасную жывёлагадоўлю, распачаты перадавымі калгаснікамі Случчыны, знашоў водгук амаль ва ўсіх раёнах БССР.

У баку ад гэтай справы стаяць, аднак, малочныя і свінагадоўчыя саўгасы. Між тым, большасць саўгасаў сустрэнае зіму непадрыхтаванымі.

Тры моманты рашаюць у саўгасах пос пех барацьбы за высокаякасную прадукцыйную жывёлу. На вырашэнне гэтых задач трэба мабілізаваць усю ўвагу і сілы нашых саўгасаў.

Зімоўку ў саўгасах рашаюць КАДРЫ. Шырокая масавая работа, памножаная на ўвяжлівыя клапатлівыя адно сіны да культурна-бытавых і матэрыяльных інтарэсаў рабочых саўгаса, правільнае партыйнае кіраўніцтва палітаддзелаў і партарганізацый забяспечыць саўгасам кваліфікаваныя кадры.

Справа не толькі ў добрай сталоўцы, у прытульным клубе, у добра пастаўленай культмасавай рабоце. Без гэтага, безумоўна, замацаваць пастаянныя кадры за саўгасамі немагчыма.

Зараз, у часе падрыхтоўкі да зімы, галоўную ўвагу ў гэтай справе патрэбна накіраваць на забеспячэнне рабочых добрымі і цёплымі кватэрамі, на рамонт старых і сканчэнне будаўніцтва новых дамоў.

Летась у выніку безгаспадарчасці, безадказнасці, а то і шкодніцкіх адносін да забеспячэння рабочых саўгасаў цёплымі памяшканнямі, многія рабочыя былі вымушаны пакідаць саўгасы. Такія факты ў гэтым годзе не павінны паўтарацца.

Можна без асаблівых капітальных затрат пашырыць жыллёвы фонд, і карэнным чынам палепшыць бытавыя ўмовы, каб па-сапраўднаму замацаваць у саўгасах патрэбныя кадры. Не абмяжоўваючыся пашырэннем жыллёвага фонда, рамонтам кватэр і інтэрнатаў палітаддзелы павінны ўзяцца за навядзенне парадка ўнутры гэтых кватэр. Трэба выгнаць з кватэр бруд, клапоў, трэба забяспечыць у іх патрэбныя гігіенічныя ўмовы. — Рабочае жыллё павінна мець культурны выгляд, — пад такім лозунгам трэба зараз разгарнуць работу за рабочае памяшканне ў саўгасах.

Саўгаснае стада да пачатку зімоўкі павінна быць ПОЎНАСЦЮ ЗАБЕСПЕЧАНА ДОБРА АБСТАЛЯВАНЫМІ АБО РАМІ, СВІНАРНІКАМІ, ЦЯЛЯТНІКАМІ. Ад гэтага залежыць далейшае павялічэнне пагалоўя, ад гэтага залежыць барацьба супроць гібелі маладняка, барацьба за павялічэнне прадукцыйнасці жывёлы. На поўнае выкананне будаўнічай і рамонтнай праграмы павінны быць кінуты лепшыя людзі саўгасаў.

Гэта пытанне мае асаблівае значэнне ў свінасаўгасах, якія, у сувязі з новай праграмай здачы таварнай прадукцыі, пакідаюць у свінарніках на зімоўку некалькі дзесяткаў тысяч парасят, прадугледжаных звыш ранейшага плана. Вось чаму ў гэтых саўгасах трэба асаблівіна павялічанымі тэмпамі ўзмацніць работу па сканчэнню новых свінарнікаў, а таксама і па прыстасаванню ўсіх прыгодных памяшканняў для захавання ў добрых умовах усяго свінога пагалоўя ў зімовы час.

Галоўную ўвагу работнікаў саўгасаў трэба накіраваць на ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ЖЫВЁЛЫ КАРМАМІ, на забеспячэнне добрага догляду на працягу ўсёй зімы.

Зусім нездавальняючыя тэмпы загатоўкі кармоў тлумачацца нядбаннем большасцю саўгасаў правільна спалучыць выкананне ўсіх сельска - гаспадарчых работ. У гэтых умовах асабліва важнае значэнне набывае сілосаванне. Між тым амаль ва ўсіх саўгасах справа з выкананнем плана сілосавання кармоў стаіць надзвычай дрэнна. Саўгасы выканалі план сілосавання кармоў толькі на 29,3 проц. На працягу кастрычніка ўвесь ПЛАН СІЛАСАВАННЯ ПАВІНЕН БЫЦЬ АБАВЯЗКОВА ВЫКАНАН.

Больш таго, план сілосавання кармоў складзен на падставе планаў сенакашэння і забеспячэння пагалоўя грубымі кормамі.

Гэтыя тры моманты ў асноўным рашаюць барацьбу за высокаякаснае пагалоўе ў нашых саўгасах. Трэба каб усе саўгасы безадкладна ўключыліся ва ўсебеларускі паход для таго, каб, разгортваючы соцспаборніцтва і ўдарніцтва, дабіцца ўсебаковай падрыхтаванасці ўсіх саўгасаў да зімы.

К. Н.

Як Аршанскі свінаводтрэст кіруе саўгасамі

(Ліст начальніка палітаддзела свінасаўгаса „Баконь")

Спробы работнікаў палітаддзела, прыбыўшых у саўгас, уключыцца ў большэвіцкае наступленне на арганізацыйна-гаспадарчым умацаванні саўгаса, сустрэлі шалёснае супраціўленне не толькі з боку класава-чужога элемента, але і з боку рада «комуністаў» з партбілетам у кішэні.

За кароткі тэрмін сваёй дзейнасці палітаддзел каля 40 проц. штатнага складу вычысціў з саўгаса. Гэта былі: афіцэры, скончыўшыя школу лётнікаў у Парыжы, былыя памешчыкі, надворныя саветнікі, былыя эсэры, адбываўшыя пакаранне-ссылку, гандляры, кантрабандысты і проста аферысты.

Увесь гэты «букет» пышна расцвятаў у выніку поўнай бяздзейнасці партыйнай і комсамольскай ячэйкі і адсутнасці рабачкома. У працягу 6-ці месяцаў, да прыезда работнікаў палітаддзела, у саўгасе не было ні аднаго схода, ні пасяджэння. Ніхто не ведаў, колькі ў саўгасе ёсць членаў партыі і комсамольцаў і хто ўваходзіць у склад рабачкома, не кажучы аб правядзенні якой-небудзь партыйна-масавай работы сярод рабочых.

Па ініцыятыве палітаддзела былі выкрыты і выключаны з радоў партыі 50 проц. усяго склада партыйнай ячэйкі, у тым ліку 80 проц. усяго бюро ячэйкі. Камісія па чыстцы не толькі зацвердзіла ўсіх выключаных з партыі, але і дадаткова выключыла 2-х членаў партыі.

Ніякіх соцыялістычных метадаў працы не праводзілася. Ва ўсіх галах панавала ўраўнілаўка і абязлічка. Трактары капітальна не рамонтаваліся, рабілася толькі прамыўка часцей, хаця акт аб правядзенні капітальнага рамонта складзен. Не былі адрамантаваны сяўаркі, бульбасаджалкі і іншы сельска-гаспадарчы інвентар. У разгары сяўбы аказалася, што саўгас не ведае, колькі ў яго ёсць вотчай зямлі і наогул зямлі, а насенне запісана не па бухгалтарскіх запісах ці па фактычнай наяўнасці, а на вока. Грузавая аўтаманышна ўсю пасеўную кампанію стаяла з-за адсутнасці запасных частак і гумы, а груз каля 150 тон у гэты час перавозіўся на конях.

За другое паўгоддзе 1932 г. і першае паўгоддзе 1933 г. раскрадзена 36 пудоў масла.

Спадзяванні работнікаў палітаддзела атрымаць дапамогу з боку Аршанскага свінаводтраста таксама не апраўдаліся. Наадварот, практыка работы трэста пацвердзіла поўную непрыгоднасць апошняга канкрэтна кіраваць саўгасамі. Цэлая серыя фактаў гаворыць аб яўна апартуністычным і нават шкодніцкім кіраўніцтве саўгасамі, якое цягнецца да апошняга дня і літаральна зрывае работу саўгаса. Вось найбольш вышуклыя моманты работы Аршанскага свінаводтраста.

У самы адказны перыяд для свінога пагалоўя, — значную частку сакавіка месяца трэст пакінуў пагалоўе без канцэнтрацыйных кармоў. У рэзультаце — нездаровы апарос, рэзкае малакроўе і вялікі падзеж. Але кіраўнікі трэста вельмі паслядоўныя. Яны дасканала ведаюць, што перыяд адыймання парасят адыгрывае важнае значэнне і таму ў маі месяцы, калі адымаюць сакавіцкі апарос — трэст зноў 17 дзён пакідае саўгас без кармоў. Не гледзячы на тэлефонныя і тэлеграфныя перагаворы і пасылкі нарачнага, трэст застаецца няўмольным.

У гэты час палітаддзел даведваецца, што саўгасу Шпакоўшчына прыслан вагон кармоў на чэрвень месяц, хоць гэты саўгас сістэматычна не выбірае сваіх кармоў са складаў і яны ў яго гінуць. Трэсту таксама вядома было, што саўгас Шпакоўшчына не рэалізаваў сваіх майскіх нарадаў. Калі мною па тэлефону перад трэстам было пастаўлена пытанне аб перадачы нам гэтага вагона кармоў, бо мы ўжо травім пасеўны матэрыял, мне адказалі: «Дагаварыцеся з дырэктарам саўгаса Шпакоўшчына». Шэсць дзён дырэктара ў саўгасе не было і дагаварыцца не было з кім. Толькі пасля пастаноўкі пытання перад сакратаром ЦК КП(б)Б тав. Гікало нам былі на другі-ж дзень высланы нарады на 47 тон кармоў. А ў рэзультаце цеганіны загінулі сотні штук парасят.

Але Аршанскі свінаводтрэст не абмяжоўваецца адными свіннямі. Ён рашыў паказаць свой «нораў» і рабочым саўгаса. У красавіку ўзамен неабходных 30 цэнтнераў (па нормах) трэст высылае 24 цэнтнеры абожжа. У канцы месяца саўгас просіць даслаць недаданыя 6 цэнтн. Толькі пасля неаднаразовых тэлефонных размоў трэст, нарэшце, 8-га мая паведаміў: «Прыміце меры да эканоміі абожжа, данага ў красавіку, бо гэта вам і на май месяц». Саўгас вымушан быў у разгар сяўбы скарацiць паёк да 300—400 грам і выдаваць прасяна-вотрубнымі лянёшкамі.

І толькі пасля ўмяшання зноў-такі тав. Гікало, мы тэлеграмаю «молнія» атрымалі нарад на абожжа. А ў рэзультаце саўгас страціў пару тысяч каў рабочых.

Саўгас заплапаваў у 1933 годзе здаць 12 цэнтнераў масла. Трэст сваім распараджэннем устанаўлае 9 цэнтнераў. Пасля таго, як палітаддзел узняў гэта пытанне, трэст скасоўвае сваё распараджэнне і ўстанаўлае 13,5 цэнтн.

Адзначаныя вігіднасці і цэлы рад другіх вымусілі палітаддзел паставіць пытанне ў ЦК КП(б)Б, які вынес пастанову: «Указаць Аршанскаму свінаводтрэсту на адсутнасць з яго боку аперадыўнасці ў кіраўніцтве саўгасам Баконь і дапушчэнне няправільнага, мажуючагася са шкодніцтвам завоза кармоў і жыўнасці саўгасу. Прапанаваць тав. Жолудаву (упаўнаркамсаўгасаў БССР) расследаваць гэтыя факты і пакараць вінаватых»...

У сувязі з тым, што Жолудаў у працягу 22 дзён не знайшоў магчымым расследаваць гэту справу, я зноў паставіў гэта пытанне з далаткам новых фактаў, але ўжо на нарадзе начальнікаў палітаддзелаў. У рэзультаце было даручана тройцы з члена бюро ЦК КП(б)Б разследаваць пытанне аб кіраўніцтве трэста.

Аднак, трэст на гэтым не супакоіўся. У саўгас прыяжджае новы дырэктар тав. Лазоўскі. Праз месяц пасля яго работы прыходзіць загад з трэста аб яго назначэнні, але існаваўшая планавая, зацверджаная трэстам стаўка дырэктара, якую атрымлівалі да яго ўсе дырэктары, зменшана на 100 руб. Гэтым самым «малойчыкі» з трэста прабуюць ушчаміць работнікаў палітаддзела.

Палітаддзел высунуў пытанне аб аб'яднанні саўгасаў Баконь і Бяздзедавічы. З гэтым не згодзен трэст, бо ён у 1931 г. раздзяліў гэтыя раней аб'яднаныя саўгасы. Пасля-ж вынесеня пастановы калегіі Наркамсаўгасаў аб аб'яднанні, трэст рашыў і гут напаскудзіць. Ён пасяленне робіць распараджэнне саўгасу Бяздзедавічы перадаць аднаму з саўгасаў жывёлагадоўчы-спецыялізаваны. Праз некалькі дзён пазаўтра перадаць таму-ж саўгасу грузагуж аўтамашыну, разбазарваючы капітоўную маемасць саўгаса Бяздзедавічы. Трэст загадзя асуджае аб'яднаны саўгас на пяжкае становішча.

Трэба раз назаўсёды заклікаць да парадку зарвавшыхся кіраўнікоў трэста.

Начальнік палітаддзела саўгаса № 403

МАКЕЕЎ.

Кулацкі манеўр з прысядзібнымі ўчасткамі

Калгас «Шлях Леніна», Жыватлодавіцкага сельсавета (Чырвонаслабодскі раён) арганізаваўся ў 1929 годзе з 15 гаспадарак. Гэтаму невялікаму калгасу прышлося вытрымаць моцны напор кулацтва, якое імкнулася разваліць яго. Дзякуючы стойкасці перадавой часткі калгаснікаў, калгас паступова рос і арганізацыйна-гаспадарча мацнеў. Сёння ён ужо яднае 170 гаспадарак з 1000 га пахаці.

Разбітыя, але недабітыя кулацкія элементы накінуліся на **Ваўністага Язэпа** пралезці ў калгас, каб разбурыць яго з сярэдзіны.

Пралазіць у калгас і **Чадовіч Васіль Цімохаў.** Гаспадарка апошняга да 20 года мела 26 га зямлі, ветраны млын, сеялкамашыны, коні і іншую жывёлу. Пралезшы ў калгас, Чадовіч, каб найлепш замаскаваць сваё кулацкае паходжанне і нутро, становіцца «актывістам» і пралазіць на пасаду старшыні праўлення.

Тут ён шырока адчыніў дзверы для кулакоў і падкулачнікаў, прыняў у калгас заўзятага ворага савецкай улады, свайго сабутыльніка кулака **Ваўністага,** якога за рад злачынных дзеянняў у гэтым годзе з калгаса выключылі і выслалі за межы БССР. Дасцца прытулак у калгасе кулаку **Камяку Івану Антонавічу.**

Пры садзейнічанні Чадовіча Камяк пралазіць на працу сакратара Жыватлодавіцкага сельсавета, а ёдзоль і ў райваенкамат, дзе і працуе зараз.

Чадовіч Васіль перш за ўсё пачаў заваёўваць сабе моцную апору сярод пасобных раённых работнікаў, гэта яму ўдаецца дасягнуць шляхам подкупу некаторых з іх.

Рахункавода ў калгасе ў 1932 годзе доўгі час не было, адступічаў уніз, рэўкамісіяй бязвінчала. Гэта становішча і пачаў выкарыстоўваць у сваіх шкурніцкіх інтарэсах Чадовіч.

З калгаса на працу 1932 года Чадовічам праданы розным раённым работнікам сотні кілограм масла і сыру. Па спісу купляўшых у калгасе малочных і іншых прадукты праходзяць дзесяткі раённых работнікаў. Акрамя гэтага ў кнігах калгаса маюцца такія запісі: «Розным асобам масла на 200 руб.».

Пасля гэтага становіцца зразумела, чаму Чадовічу ўдаецца захаваць амаль ва ўсіх калгаснікаў злякіці прысядзібныя участкі, а найбольш заможныя гаспадаркі мелі найбольшыя сядзібы. Так 44 гаспадаркі маюць зямлі аднаго га сядзібы. Ад 0,60 га да 0,07 га маюць 67 гаспадарак і толькі 23 гаспадаркі маюць законную норму прысядзібнай зямлі не звыш 0,50 га.

Аб гэтым добра ведаюць усе райарганізацыі, ведаюць і маўчаць. Але вось надыходзіць палавыя работы. Назіраюць такіх зялёных прысядзібных участкаў у калгаснікаў моцна дае сябе адчуваць. Схаваць гэты факт больш не ўдаецца. Райарганізацыі ставяць пытанне аб абрэзцы прысядзібных участкаў. Чадовіч рашае выкарыстаць гэту работу для таго, каб падарваць давер'е калгаснікаў да партыі, да савецкай улады, для таго, каб разбурыць калгас.

Не правёўшы ніякай растлумачальнай работы, не падрыхтаваўшы актыў калгаснікаў, Чадовіч ставіць на сходзе пытанне і патрабуе абагуліць усе азімыя культуры, засеяныя на прысядзібных участках.

Ён едзе ў раёна да **Кавальчука** і скарджаціца: кулакі сарвалі справу абагулення пасеву на сядзібах. Кавальчук давярае Чадовічу і рашае паехаць правячыць кулакоў...

Скліканасца сход і перш чымся абгаварыць пытанне абагульнення высоўваюць спіс 15 калгаснікаў—абмеркаваць для індывідуальнага абкладання. У спісу «15»—беднякі і сераднякі, але што да гэтага? Пасля дэталёвай «прапрацоўкі» выносіцца прапанова: «у сувязі з недастатковасцю фактаў для індывідуальнага абкладання пытанне пакінуць адчыненым для падбора больш матэрыялаў».

Такім чынам, пушчуўшы, што называецца ўвесь сход, Кавальчук і другія заправілы сходу пераходзяць да пытання абагулення азімых на сядзібах.

Сход ішоў тры дні. Якія толькі пагрозы на гэтым сходзе не былі: і «раскулачым», і «вышлем» і т. д., але ўсё-ж такі паколькі ніякай падрыхтоўчай работы не было праведзена, **кулацкія** элементы арганізавалі справу так, што з прысутных на сходзе 150 калгаснікаў галасавалі за абагуленне толькі 20, з іх 15—гэта тыя, якіх абгаварэалі для індывідуальнага абкладання. Але Кавальчука і гэта здавальняе. Пытанне вырашана,—зазяўле ён,—большасць галасоў пасеву абагулены і з'яўляецца калгаснымі!

Замест таго, каб растлумачыць калгаснікам сутнасць частеновы ЦК і СНК і правільна правесці яе ў жыцці, Кавальчук пашоў на шляху голага адміністраванню, па шляху кампрамэнтацыі пастановы ўрада.

Чадовіч радаваўся вынікам сваёй кулацкай работы, чакаў дзень са дня развала калгаса.

Раённае кіраўніцтва ведала пра ўсе гэтыя факты, але верыла Чадовічу (тым, больш выяжджаў-жа Кавальчук) і лічыла, што ўсё робіцца правільна.

Аднак, калі надышоў час жніва, калгаснікі разам са жнівом кальныя пасеваў пачалі жаць і свае сядзібы. І асабліва былі ўпэўнены ў сёй працаце тыя калгаснікі, якія мелі сядзібы да 0,50 га.

І вось пачаў бесперапынна звініць тэлефон з сельсавета ў РК КП(б)Б, у РВК, у райаз—адказу няма. І, калі сядзібы ўжо былі зжаты і многімі звезены, тады пракуратура і пасуд атрымалі аўтарытэтную ўстаноўку «спыніць самапраўства». І пракурор тав. Рубеж і суддя тав. Шабалін прыступаюць да выканання атрымаўшай дырэктывы.

13/VIII выязжае суд на месца і суддзіць 7 калгаснікаў «за самапраўства». На другі дзень у пасуд выклікаецца яшчэ 5 асоб і іх таксама судзяць за самапраўства, 12 калгаснікаў — суддзі Чырвонаслабодскага раёна асуджаны, частка антрафавана.

Аб тым, што ў калгасе з боку пасобных калгаснікаў было самапраўства, і асабліва — з боку заможных гаспадарак, гэта бясспрэчна. Іх трэба было судзіць.

Цікава, чаму суд і суддзя тав. Шабалін не зацвяжылі гаспадарку **Камяка Івана Антонава,** гаспадарку кулацкую, якая нажала і звезла 5 кап жыта? Ці не таму, што Камяку ўдалося пралезці на работу ў райваенкамат?

У дадатак вельмі цікава застанавіцца на такім факце. Той-жа суд пад старшынствам тав. **Шабаліна** разглядаў справу кулака Чадовіча Васіля (старшыня калгасу), які абвінавачваўся ў бязгаспадарчасці, і прыгаварыў яго да аднаго года прымусовай працы.

Згодна маючыхся матэрыялаў Чадовіч заслугоўваў болшага пакарання, але паколькі ён карыстаецца «аўтарытэтам» у работнікаў раёна, суд палічыў немэтазгодным далаваць яго.

Чадовіч застаўся ў калгасе, ды не радавым калгаснікам, а брыгадзірам, дзе і арудуе па-ранейшаму...

Нельга абыйсці і такога факта, што ў раёне надзвычай дрэнна арганізавана дапаўнаўдзела МТС. Замест стварэння ўмоў і дапамогі ў рабоце палітаддзела пасобныя работнікі хіляюць, заяўляючы, што палітаддзельцы нічога не разумеюць у сельскай гаспадарцы і т. д.

Начальнік палітаддзела МТС тав. **Шэфцер** сігналізаваў у РК КП(б)Б аб «лявацкіх» загадах у калгасе «Л. Н.» і патрабаваў выкрываючых дакументальных памылак. Райработнікі прыязджаюць, што факты «лявацкіх» загадаў бесспрэчна мелі месца, але выкрываць іх зараз не мэтазгодна і не выгадна. Выправім—заўважыць кіраўнікі, — пасля ўборкі і сяўбы, а зараз небяспечна, бо пашкодзім ўборчаму і сяўбе азімых.

Ми ўпэўнены, што адказныя органы хутка спакладуць работу Чырвонаслабодскіх арганізацый.

АНТОН ЗАКАРДОННЫ.

КОНКУРС ССТ і МІЖРАЙБАЗ

Дапамагчы калгаснікам будаваць культурнае заможнае жыццё!

СЕЛЬСПАЖЫЎТАВАРЫСТВЫ І МІЖРАЙБАЗЫ ПАВІННЫ СТАЦЬ САПРАЎДНЫМІ АРГАНІЗАТАРАМІ СОВЕЦКАГА ГАНДЛЯ.-45 проц. ПЛАНА ТАВАРАЗВАРОТА IV КВАРТАЛА ДА КАСТРЫЧНІЦКІХ СВЯТ

Пераможна завяршым 2-гі этап конкурса

Вынікі барацьбы за выкананне плана тавараазвароту ў трэцім квартале яўна незадавальняючыя. Спажывецкая сістэма БССР у гатым квартале НЕДАВЫКАНАЛА ПЛАН НА 16 МЛН. РУБ.

Дзе-ж прычыны прарыва?

Трэба проста сказаць, што побач з такімі канцэрацыйнымі арганізацыямі, якія правільна зразумелі свае задачы ў новай абстаноўцы, пасаўлому ўключыліся ў конкурс на лепшае ССТ і перабудавалі сваю работу, мы маем значную колькасць арганізацый, якія не падпарадкоўвалі гандаль новым задачам і адсталі ад жыцця.

Рад райсаюзаў і ССТ дрэнна кіравалі тавараазваротам, дапусцілі самацёк у совецкім гандлі, не ўлічылі спецыфічных асаблівасцей 3-га квартала, калі асноўнае мяса калгаснікаў працавала на полі і таму трэба было перанесці гандаль у калгас і брыгаду.

Выключна вялікі адмоўны ўплыў аказаў на работу кааперацыі той факт, што сістэма аж паўтара месяца патрацціла на раскачку і не разгарнула з першых-жа дзён большэвіцкіх тэмпаў. Пераважная частка спажывецкіх таварыстваў і райсаюзаў абмежаваліся гандлем толькі плануемымі таварамі, не вялі барацьбы за своячасовую адгрузку тавараў прамысловасцю.

«Звязда» ў свой час указвала, як на адну з прычын прарыва ў тавараавароце, на тое, што Белкаапсаюз механічна адмацаваў многія сельспажыўтаварыствы ад райсаюзаў, ліквідаваў складскія функцыі апошніх параліжаваўшы гэтым гандаль у радзе месц. Ён у сваім пляцыра-адміністрацыйным захапленні зняў адказнасць райсаюзаў за гандаль, звязаў ініцыятыву сельспажыўтаварыстваў і райсаюзаў у пакупцы тавараў.

Трэба адзначыць, што гэты па сутнасці галавацяпскі акт яшчэ і цяпер у радзе месц не выпраўлен.

Бебруйскаму райсаюзу, напрыклад, да апошняга часу не далі склада для тавараў.

Нарэшце, Белкаапсаюз не ўлічыў указанняў «Звязды» аб тым, што многія кааператары замест задавальнення ўзросшых патрабаванняў калгаснікаў разам з кулаком працаўнілі шкодніцкую гаворку аб «падзоўні працежаздольнасці сялянства».

Ці варта даказваць, што такія «тэорыі», такі сабатаж совецкага гандля пад прадлогам «адсутнасці попыта» пыюць ваду на млын класавага ворага, што гэта—адна з прычын зрыва тавараазвароту.

Прайшлі ўжо паўтары дэкады 4-га квартала. Ці здолела кааперацыя ў цэлым перакінуцца на ліквідацыю прарыва, на выкананне плана тавараазвароту? Ці навёрстваюцца тэмпы рэзка зніжаныя ў трэцім квартале?

Не. За выключэннем пасобных арганізацый, большасць райспажыўсаюзаў і сельспажыўтаварыстваў з першых-жа дзён квартала не ўзялі яшчэ большэвіцкага разгона, каб штодзённа, штомесячна выконваць планы тавараазвароту. Паўтараюцца памылкі 3-га квартала. Гэта становішча, на жаль, не выклікала законнай трывогі ні ў райсаюзах, ні ў самім Белкаапсаюзе.

Цэнтральная конкурсная камісія разам з сельспажыўтаварыствамі Бабруйскага куста пастанавіла ДЛЯ ЗАВЯРШЭННЯ ДРУГОГА ЭТАПА КОНКУРСА СЕ

СУСВЕТНЫ ДРУК АБ ПАВЕДАМЛЕННІ ТАСС

КАМЕНТАРЫ ФРАНЦУЗСКАЙ ПРЭСЫ

ПАРЫЖ, 13. (БЕЛТА).

Газеты, каментуючы совецка-японскія адносіны усімі спосабамі падкрэсліваюць незацікаўленасць СССР у ваенным канфлікце і яго імкненне ўтрымаць такога канфлікта. Друк выказвае надзею, што мірная палітыка СССР дасць магчымасць у канцы канцоў адхіліць ваенны канфлікт на Далёкім Усходзе.

«Журналь» падкрэслівае, што совецкі ўрад шчыра жадае захаваць мір на Далёкім Усходзе. «Пці журналь» называе мірную палітыку СССР «духоўнай асновай совецкай дзяржавы». «Рэпюблік» заяўляе, што калі ўзброены канфлікт усё-ж выбухне, дык ва ўсякім выпадку «не Совецкі саюз першы адкрые стральбіну».

Друк вымушан канстатаваць, што ўся палітыка Японіі пабудавана на актыўнай падрыхтоўцы да развязвання ўзброенага канфлікта, у той час, як ваенныя падрыхтаванні СССР на Далёкім Усходзе прадыктаваны меркаваннямі неабходнай абароны і не прадстаўляюць сабой патрозы для Японіі.

Характэрна, што ў каментарыях правых газет адсутнічае тэзіс, які звычайна імі высоўваецца, што Японія — «апора парадка і аплот супроць комунізма ва Усходняй Азіі». Выключанне складае толькі «Дэпеш колоніяль», аднак, гэта-ж газета лічыць патрэбным падкрэсліць Японію, заяўляючы, што роля, якую Японія, па думцы газеты, адыгрывае на Далёкім Усходзе, яшчэ не дае ёй права прыпісваць ваенны канфлікт. Пры гэтым газета раіць Японіі не забываць, што ў «ПАЗШ, Англіі і Францыі таксама ёсць інтарэсы, якія яны павінны абараняць на Ціхім акіяне, дзе павінна быць захована раўнавага сіл».

Большасць газет стрымана і лаяльна каментуе апублікаванне ў Маскве дакументаў, якія выкрываюць правакацыі японскага ўрада. Не выказваючыся проста па пытанні аб сапраўднасці гэтых дакументаў, газеты толькі падкрэсліваюць, што калі дакументы сапраўдныя, то на японскі ўрад кладзецца цяжкая адказнасць.

«Юманітэ», указваючы на японскія правёкацыі ў адносінах СССР, заклікае французскіх рабочых стаць на абарону СССР. «Працяніваючы сваю цвёрдую палітыку міра, — заяўляе газета, — і апіраючыся на свае дыпламатычныя поспехі, дасягнутыя ў адносінах з заходнімі краінамі, Совецкі саюз зробіць усё, каб разбіць гэтыя злачынныя замыслы. Народ, на які нападаюць, і які з'яўляецца гаспадаром свайго лёса, здолее абараніцца. Але ён павінен таксама мець магчымасць разлічваць на дапамогу працоўных усяго света, якія выступаюць адзіным магутным рэвалюцыйным фронтам у яго абарону, наперакор подлай палітыцы сацыял-фашысцкіх лідэраў».

АРГУМЕНТЫ ЯПОНІІ НЕГРУНТОЎНЫЯ

ПАРЫЖ, 13. (БЕЛТА).

«Эр нувель» заяўляе, што япона-совецкія супярэчнасці з повану КУЧ павінны прыцягнуць зараз усеагульную ўвагу.

«Совецкі саюз,—піша газета,—мае на КУЧ безумоўныя правы. Ён з'яўляецца яе ўласнікам, і не мае ў сучасны момант ніякіх намераў адмаўляцца ад гэтай уласнасці без кампенсацыі.

Японія ўсяго гэтага не аспрэчвае, а абмяжоўваецца толькі заявай, што Манчжоу Го дзейнічае свабодна, што ў Манчжоу Го свае намеры.

Аднак, Японія не павінна была-б карыстацца такім аргументам. Кожны ведае, што Манчжоу Го атрымлівае свае дырэктывы з Токіо. Вось чаму, калі СССР звяртаецца да Японіі з просьбай пакласці канец малеўрам, якія, відавочна, маюць сваёй мэтай захват КУЧ, Японія не павінна адгаварвацца няведаннем, і прабаваць зняць з сябе адказнасць».

ГАСПАДАР МАНЧЖОУ-ГО — ТОКІО

ТОКІО, 14. (БЕЛТА).

Каментуючы апублікаванне дакументаў «Джапан кронікл» канстатуе, што «галоўнае затрудненне совецка-японскіх адносін заключаецца ў настойваннях Японіі, што перагаворы аб продажы КУЧ з'яўляюцца толькі справай Манчжоу Го і што Японія не мае нічога супольнага з гэтымі перагаворамі.

— Падобныя сцвярджэнні,—гаворыць далей газета,—натуральна, не стваруюць вялікага ўражання на СССР, бо там улічваюць, што галоўным прадстаўніком Манчжоу Го ў перагаворах з'яўляецца джэнтльмен па прозвішчы Охасі».

АРАКІ ПАТРАБУЕ ДАЛЕЙШЫХ УЗБРАЕННЯЎ

ТОКІО, 11. (БЕЛТА).

Агенцтва Дэмпо Цусін перадае, што на нарадзе пяці міністраў Аракі, настойваючы на павялічэнні ўзбраенняў, указаў на складанасць міжнароднага становішча Японіі наогул і асабліва падкрэсліваў ускладненне ўзаемаадносін паміж Японіяй і СССР.

Адказваючы Аракі, Хірота прызнаў, што адносіны з Совецкім Саюзам сталі больш напружанымі, аднак, Хірота знаходзіць, што яны «дасягнулі такога пункта, калі неабходна ўжыць дыпламатычныя сродкі да іх урэгулявання. Засталося яшчэ досыць магчымасцяй дыпламатычнага вырашэння японска-совецкіх разгалосаў і мірнага вырашэння праблемы адносін Японіі з іншымі краінамі».

Паводле слоў Дэмпо Цусін, прэм'ер Саіто амаль не прымаў удзела ў дыскусіі, хоць «вядома, што ён схіляецца да падтрымання Хірота».

Падзенне папер на токійскай біржы

ТОКІО, 13. (БЕЛТА).

Пад уплывам чутак аб моцным абвастрэнні совецка-японскіх адносін большасць папер на такійскай біржы 13 кастрычніка ўпала на 5-8 пунктаў, у тым ліку нават акцыі раду ваенных заводаў. 14 кастрычніка, дзякуючы заспакойваючым заявам ваенных колаў курсы зноў павысіліся на 4-6 пунктаў.

СЕНАТАР РЭЙНОЛЬД АБ СССР

Н'Ю-ЮРК, 13. (БЕЛТА).

Дэмакратычны сенатар Рэйнольд, які вярнуўся з паездкі ў СССР, заявіў, што ён адзіўлен дасягненнямі СССР.

— Ленінград,—заявіў Рэйнольд, — самы ажыўлёны порт у Эўропе. Судны ўсіх буйных прыморскіх краін грузяцца лесаматэрыялямі і іншымі тавамі, але суднаў пад амерыканскім флагам няма.

Працэс аб падпале рэйхстага

СУД ДЫКТУЕ „СВЕДКАМ" ІХ „ПАКАЗАННІ"

ПРАГА, 13. (БЕЛТА).

Як паведамляюць з Берліна, на пасяджанні суда 12 кастрычніка працягваўся далей допыт новых сведак. Іх паказанні такія-ж падазроныя і супярэчлівыя, як і паказанні папярэдніх.

Асаблівай увагі заслугоўваюць у гэтых адносінах паказанні паліцэйскага Лісінкейта і інспектара рэйхстага Скрамовіца.

Лісінкейт, у прыватнасці, заявіў, што пасля арышта Ван дэр-Люббе да яго падбег Скрамовіц і крыкнуў: — «Ідземіце хутчэй; адасюда, унізе ёсць яшчэ падпальшчыкі».

Лісінкейт сцвярджае, што яны спусціліся ўніз, але там нікога не было.

Ацэньваючы рассеянць уражанне, што ў рэйхстагу былі яшчэ і іншыя людзі, якіх не затрымалі, пракурор Вагнер просіць запытаецца ў Скрамовіца:

«Вы сцвярджалі, што ўнізе яшчэ былі падпальшчыкі? Ці бачылі вы кагонебудзь?»

Скрамовіц спалохана адказвае, што ён, моў, заявіў, што адзін чалавек не мог гэтага зрабіць, і што для гэтага павінна было быць 6-8 чал. Але гэта было толькі дапушчэнне, ён, моў, сам нічога не бачыў.

Далей, Скрамовіц апісвае гарэўшую пленарную залу рэйхстага і гаворыць аб многіх невялікіх аднях, так што незразумела, як магла выгарэць упчэнт уся зала, тым больш, што ў гэты час, пасьля слоў сведкі, ужо працавалі пажарныя. Вельмі важна заява Скрамовіца, што ў адным крэсле ляжаў факел, які гарэў. Ён яго адкінуў нагой.

У матэрыялах абвінавачання старанна выкінуты нават намёкі на факелы, якія, як відома належаць да ўлюбёных атрыбутаў штурмавікоў. Упамінанне сведкі аб факеле выклікае рад запальчывых пытанняў старшыні, пракурора і «абаронцаў».

У рэзультаце сведка «напраўляецца» і гаворыць, што ён прыняў гэта за факел, але не ўпэўнен у гэтым і яму невядома таксама, куды факел дзеўся.

Ва ўсякім выпадку, з гэтых паказанняў выцякае, што нехта свайчасова пазбавіўся адзіначыць гэты важны рэчавы доказ. У заключэнні Скрамовіцу задаюць груба наводзячыя пытанні: «Друк сцвярджаў, што вы нібыта заўчасна адпусцілі ў той дзень служачых — гэта праўда?»

Сведка, увільваючы ад простага адказу, гаворыць, што ў яго функцыі не ўваходзіць дачасны водпуск служачых.

Затым дапытваецца начны вартаўнік рэйхстага Вендт. У пачатку яго допыта старшыня лічыць патрэбным заявіць, што паміж 9-10 гадзінамі вечара ніхто не робіць абхода рэйхстага.

Вендт паказвае, што ў хуткім часе пасля 8 гадзін Торглер вёў пры ім тэлефонны разгавор, а затым разам з Кенеманам і сакратарыят комфракцыі вышаў, перадаўшы яму ключы ад памяшкання комфракцыі.

На пытанне старшыні — «ці не заўважылі вы чаго-небудзь асаблівага» — Вендт адказвае: «Не» і падкрэслівае, што дэпутаты вельмі часта пакідалі рэйхстаг позна.

Затым Вендт апісвае, як паліцэйскі паведаміў яму аб пажары, і як ён па тэлефону паведаміў аб гэтым начальству. На пытанне старшыні, ці не пакінуў будынак рэйхстага ў хуткім часе пасля пачатку пажара які-небудзь чалавек у штацкім, Вендт дае нечаканы і многазначны адказ: «Не».

«Толькі пазней з будынка выйшаў чалавек у штацкім, прад'явіўшы дэпутацкі пропуск, і таму я яго прапусціў. Паліцыя затрымала яго, але пасля таго, як афіцэр праверыў яго дакументы, ён пайшоў. Праз 15 мінут гэты дэпутат вярнуўся і заявіў, што ён забыў нешта ў рэйхстагу. Я яго не ўпусціў і накіраваў да паліцэйскага афіцэра. Гэта было каля 10 гадзін».

Такім чынам, наперакор сцвярджэнням, што Торглер нібыта апошнім пакінуў рэйхстаг, аказваецца, што там у часе пажара ў рэйхстагу знаходзіўся нейкі дэпутат, які спакойна вышаў адтуль у разгар пажара, і якога не затрымаў паліцэйскі, аб чым ні слова не ўпамінаецца ў падрабязнейшых паведамленнях аб пажары, і аб чым ні слова не гаворыцца ў судовай справе.

Самае дзіўнае ў тым, што, згодна паведамлення Вольф, ні старшыня, ні пракурор не задаюць сведцы пытання — хто-ж быў гэты дэпутат. Ва ўсякім выпадку відавочна — не комуніст і не сацыял-дэмакрат, бо ў гэтым выпадку яны сядзелі-б на лаве падсудных. Замест высвятлення гэтай таемнай лічнасці, абаронца Зак задае Вендту пытанне, ці ўпікаў Торглер з рэйхстага. Вендт адказвае, што Торглер і яго спадарожнічі выйшлі з рэйхстага спакойна, як і заўсёды.

РЭПРЭСІІ СУПРОЦЬ ЗАМЕЖНЫХ АДВАКАТАЎ і КАРЭСПАНДЭНТАЎ

ПРАГА, 14. (БЕЛТА).

Як паведамляюць з Берліна, 14 кастрычніка ў пачатку пасяджэння суда старшыня Бюнтер заявіў, што пазбавіў балгарскіх адвакатаў Дзечава і Грыгорава, амерыканскага адвката Галахера і французскага Вілярда права прысутнічаць на працэсе за тое, што яны ў лісце да «абаронцы» Тэйхерта пратеставалі супроць адсекаў над Дзімітравым, і заявілі, што гэтыя адсекі апраўдваюць тую пагардлівасць, з якою Дзімітраў адносіцца да судовых улад.

Мера суда выклікала велізарнае абурэнне сярод прысутных на працэсе прадстаўнікоў замежнага друку. Чакаюць, што немінучыя далейшыя правалы абвінавачання будуць суправаджацца аналагічнымі рэпрэсіямі ў адносінах замежных журналістаў.

АРЫШТ ГРЫГОРАВА, ДЗЕЧАВА, ГАЛАХЕРА і ВІЛАРДА

ВАРШАВА, 13. (БЕЛТА).

З БЕРЛІНА ПАВЕДАМЛЯЮЦЬ, ШТО БАЛГАРСКІЯ АДВАКАТЫ ГРЫГОРАЎ і ДЗЕЧАЎ, АМЕРЫКАНСКІ АДВАКАТ ГАЛАХЕР і ФРАНЦУЗСКІ АДВАКАТ ВІЛАРД, ЯКІЯ ПРЫСУТНІЧАЛІ НА ПРАЦЭСЕ АБ ПАДПАЛЕ РЭЙХСТАГА, РАПТАМ БЫЛІ АРЫШТАВАНЫ Ў ЗАЛІ СУДА І ДАСТАЎЛЕНЫ Ў ПАЛІЦЭЙ-ПРЭЗІДЫУМ.

ФАШЫСТЫ ЗДЗЕКУЮЦЦА НАД БЕСПРАЦОЎНЫМІ

ВЕНА, 12. (БЕЛТА).

Згодна апошніх паведамленняў з Германіі, дапамогі беспрацоўным, выплачваемыя, так званымі муніцыпальнымі дабрачыннымі касамі, у верасні зноў зніжаны да 10 мільёнаў марак, і зараз складаюць усяго 55 млн. марак супроць 80, якія выплачваліся яшчэ ў месяцы непасрэдна перад прыходам нацыянал-сацыялістаў да ўлады.

Яшчэ горш тыя здзекі, якімі ў дадатак да мізэрных грошай узнагароджваецца беспрацоўны, вымушаны звяртацца за дапамогай.

Муніцыпальная дабрачынная каса Нюрэнберга, напрыклад, абвясціла, што у далейшым будзе правяраца, ці не карыстаецца беспрацоўны дапамогай «без устутранага маральнага права на гэта», г. зн. ці не з'яўляецца ён «гультаём і лодарам», бо «дзяржава нацыянальнага адраджэння» павінна рабіць розніцу паміж «вартымі» і «нявартымі беспрацоўнымі».

Але, з прычыны таго, што пануюцце «варты беспрацоўны» вельмі расцягнене, дык муніцыпалітэт горада Нюрэнберга, зразумела, набывае поўнае і «законнае» права пазбаўляць дапамог столькім беспрацоўным, колькі яму ўздумаецца.

У некаторых месцах практыкуюцца яшчэ больш свазласаблівыя меры «дапамогі» беспрацоўным. Так, агенцтва Вольф паведамляе з Берліна, што «ва многіх абшчынах Фальца», дзе спынена выплата дапамог беспрацоўным, мелі месца пакаранні, а імёны біццё розгамі і прывязванне да пастаўленага на рынкавай плошчы ганебнага слупа.

Саксонскі надзвычайны суд прыгаварыў гэтымі днямі аднаго беспрацоўнага да 4-х месяцаў турэмнага зняволення за тое, што ён адважыўся заявіць, што саксонскі камісар аховы здароўя Вернер атрымлівае гадавы аклад у 72 тыс. марак, у той час як беспрацоўным зніжаюць іх грашовыя дапамогі.

Аб становішчы сумеснай работы аршанскай, лоеўскай і стара-дарожскай РКК-РСІ з друкам і аб рэагаванні на допісы і лісты працоўных

Пастанова прэзідыума ЦКК КП(б)Б і калегіі НК-РСІ БССР ад 3-га кастрычніка г. г.

Прэзідыум ЦКК і калегія НК—РСІ ад'значаюць:

Дырэктывы ЦКК аб сумеснай рабоце КК—РСІ з друкам не знайшлі сістэматычнага праламлення ў штодзённай рабоце аршанскай і лоеўскай КК—РСІ.

Праведзеная сумесная работа з гэтымі РКК з друкам у пытаннях грамадскага харчавання, захавання конскага паталоўя (Лоеў), арганізавання грузаў, падрыхтоўкі да новага навучальнага года (Орша)—з'яўляецца далёка невыстарчальнай. Да складання лісткоў РКК па гэтых пытаннях не былі прыцягнуты актывісты РСІ і селькоры, а ў большасці сваёй лісткі арганізоўваліся непасрэдна самой рэдакцыяй і адным з работнікаў РКК—РСІ.

Лічыць недапушчальнай адсутнасць сумеснай работы з друкам аршанскай і лоеўскай КК—РСІ ў пытаннях уборкі, абожжаздачы, асенняй сяўбы. Больш таго, сенсацыі РСІ і лёзавы друк, асабліва ў Аршанскім раёне ў большасці сельсоветаў і калгасаў адсутнічаюць.

У выніку адсутнасці настойлівай барацьбы старадарожскай, аршанскай РКК—РСІ і райгазет за рэалізацыю пастановы ЦКК аб рэагаванні на допісы і лісты працоўных рад арганізацый гэтых раёнаў (РВК, райзо, райфа, пракуратура) сталі на шлях яўнага ігнаравання гэтых пастаноў. Больш таго, у самой аршанскай КК ляжаць дзесяткі не разгледжаных допісаў, аб чым правіль на сігналізавала «Звязда» ад 14/IX у фельетоне «Лірыка і кодэкс» і «Рабочий» (ад 25/IX--33 г.), а стара-дарожская КК у асобе старшыні тав. **Лукашэвіча** стала на шлях ігнаравання пастановы ЦКК ад 4 мая г. г., схаваўшы гэту пастанову, як сакрэтную, і не абгаварыўшы яе на прэзідыуме, што прывяло да замарожвання ў раённых арганізацыях 411 допісаў, як эусім правільна адзначыла газета «Калгаснік Беларусі» ад 21 ліпеня ў артыкуле «Старадарожская КК—РСІ не ўзначальвае барацьбы за дзейснасць лістоў працоўных».

Прэзідыум ЦКК КП(б)Б і калегія НК РСІ Бел. пастанаўляюць:

1. Прыняць да ведама, што ў часе аб следвання арганізаваны секцыі РСІ ў Межаўскім, Стайкаўскім сельсоветах і групы сацдзейнасці ў саўгасе Межава, калгасе «1 мая» (Орша); секцыі РСІ ў Пярэдзельскім і Старадубскім сельсоветах, групы сацдзейнасці ў Дняпроўскай комуне (Лоеў), наладжана работа лёзавога друку гэтых сельсоветаў і тое, што РКК і райгазеты гэтых раёнаў распрацавалі канкрэтныя мерапрыемствы па ажыўленню работы секцый РСІ, лёзавога друку і ўзгадненню сумеснай работы КК—РСІ з друкам.

2. Абавязаць усе райКК і газеты ўсіх раёнаў распрацаваць каляндарныя планы па ажыўленню работы секцый РСІ ў сельсоветах, групп сацдзейнасці ў саўгасах і калгасах, ажыўленню работы лёзавога друку і разгортванню сумеснай работы з друкам, ацэньваючы ў гэту работу актывістаў РСІ і селькораў. Як ад лёзу з лепшых форм сумеснай работы з друкам, практыкаваць згодна раней шых паказанняў сістэматычны выпуск «Лісткоў РКК—РСІ», праводзячы сумесныя мерапрыемствы па пытаннях збожжаздачы, узнёсшую заблёва, размеркаванню ўраджаю ў калгасах, уборкі і адгрузкі бульбы пролетарскім центрам. Абавязаць усіх старшынь РКК да 15/X дасласць у ЦКК каляндарныя планы сумеснай работы з друкам.

3. За яўнае ігнараванне пастановы ЦКК ад 4/V г. г., схаванае і неабгаварэнне гэтай пастановы на прэзідыуме РКК, у якой РКК пазнарэдзвалася за нерэагаванне на допісы і лісты працоўных, што з'яўляецца грубейшым зашчэкам большэвіцкай крытыкі і самакрытыкі—старшыню старадарожскай КК тав. **Лукашэвіча** з работы знята.

4. Прыняць да ведама, што загадчык бюро скаргаў аршанскай КК—РСІ т. Палей за дапушчэнне такога становішча ў справе рэагавання—з работы знят з абвяшчэннем яму вымовы, і тое, што прэзідыумам РКК прыняты рашучыя захады да наладжвання рэагавання ў раёне. Прапанаваць прэзідыуму аршанскай РКК прыцягнуць канкрэтных вінаватых у бюракратычна-фармальным падыходзе да справы рэгавання да найстражэйшай адказнасці.

5. Прапанаваць аргаддзелу ЦКК КП(б)Б праверыць становішча рэагавання ў наркаматах — НКЮ, НКФіне, прыёмнай ЦВК, Наркамаеме і Наркамкомунгасе, паставіўшы вынікі праверкі 23/X—33 г. на прэзідыуме ЦКК КП(б)Б.

6. Абавязаць усе райКК—РСІ ў 10-дзённы тэрмін правесці праверку ўсіх раней паступіўшых да іх і ва ўстановах раёна да гэтага часу нерасследаваных рабселькораўскіх лістоў і допісаў, забяспечыўшы безагаворачнае выкананне ўказання ЦКК УсеКП(б) аб тым, што да расследвання лістоў і допісаў павінна быць прыступлена ў дзень іх атрымання і аб выніках неадкладна паведамлена радакцыі газеты і ЦКК—НК РСІ, прыцягваючы канкрэтных вінаватых у бюракратычна-фармальным падыходзе да справы рэагавання і ігнаравання пастаноў ЦКК па гэтаму пытанню да суровай адказнасці аж да знятня з работы, выключэння з партыі і аддачы пад суд.

За старшыню ЦКК КП(б)Б—нам. наркома БССР КОНІК.

АБ СТАУКАХ АРЭНДНАЙ ПЛАТЫ ЗА БУДЫНКІ І ПАМЯШКАННІ, ЯКІЯ АРАНДУЮЦЦА ДЛЯ ГАНДЛЕВА-ПРАМЫСЛОВЫХ І СКЛАДАЧНЫХ МЭТ СПАЖЫВЕЦКАЙ КООПЕРАЦЫЯЙ

Пастанова Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта і Совета Народных Камісараў БССР

У адпаведнасці з пастановаю Совета Народных Камісараў БССР № 1761 ад 16 жніўня 1933 г. «аб фінансавым станоўішчы спажывецкай кааперацыі» Цэнтральны Выканаўчы Камітэт і Совет Народных Камісараў БССР пастанаўляюць:

1. Прапанаваць усім гарадскім советам і раённым выканаўчым камітэтам не дапускаць ні простага ні ўскоснага (шляхам перавода гандлёвых памяшканняў з ніжэйшых разрадаў у вышэйшыя) павышэння арэндной платы за гандлёвыя памяшканні, якія арандуюцца спажывецкай кааперацыяй, у параўнанні з сярэднім узроўнем 1932 года і скасаваць усе пастановы, якія гэтаму перашкаджаюць.

2. Устанавіць, што стаўкі арэндной платы за гандлёва-прамысловыя і складачныя памяшканні, якія вызначаны п. 2 пастановы ЦВК і СНК БССР за 9 чэрвеня 1933 г. «аб парадку здачы ў арэнду і аплаты будынкаў, памяшканняў і пляцоў, якія арандуюцца для гандлёва-прамысловых і складачных мэт» (З. З. БССР, 1933 г., № 23, паст. 168), не чапярэдзяюцца на спажывецкую кааперацыю з 20 жніўня 1933 г.

3. Прапанаваць НК камунальнай гаспадаркі і НК Фінансаў распрацаваць на працягу дэкады разам з Белжылсаюзам і Белжаасаюзам новыя стаўкі арэндной платы за гандлёва-прамысловыя і складачныя памяшканні для спажывецкай кааперацыі, выходзячы з сярэднага ўзроўню гэтых ставак у 1932 годзе, і падаць іх на зацвярджэнне Совета Народных Камісараў.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР А. ЧАРВЯКОЎ.

Старшыня Совета Народных Камісараў БССР М. ГАЛАДЗЕД.

Сакратар Цэнтральнага Выканаўчага Камітэта БССР М. ЛЯЎКОЎ.

12 кастрычніка, 1933 г.

Ні мінуты самасупакоенасці

Пролетарыят СССР пад кіраўніцтвам нашай партыі заваёўвае ўсё новыя і новыя перамогі на ўсіх участках соцыялістычнага будаўніцтва. Наша краіна не мела сваёй уласнай авіяцыйнай прамысловасці, але ўжо ў выніку першай пяцігодкі авіякрамысловасць створана і развіваецца. Такавы пераканаўчыя довады рэальнасці нашых планаў, якія ажыццяўляюцца жывымі людзьмі, поўных гераізма і рэвалюцыйнага ўздыму.

Бліскучая ініцыятыва гомельскіх рабочых і калгаснікаў, падтрыманая мільёнамі працоўных БССР, аб пабудове на ўласныя сродкі авіяэскадрыльі імя тав. Кагановіча з'яўляецца яшчэ адным выразным праяўленнем гэтага рэвалюцыйнага ўздыму. Ініцыятыва не засталася прыгожай фразай. Яна ператворана ў канкрэтныя справы. Сёння на бягучым рахунку—1.007.721 ф. Больш мільёна рублёў працоўных БССР добраахвотна ўнеслі ў фонд пабудовы эскадрыльі, добра разумеючы, што гэтым самым яны ўзмацняюць абаронную магутнасць соцыялістычнай бацькаўшчыны сусветнага пролетарыята.

Мільён сабраных рублёў гэта, бясспрэчна, вялікая перамога, гэта сур'ёзны ўклад у соцыялістычнае будаўніцтва, у авіяфлот. Але ці можна задаволіцца сабранай сумай, калі, прыкладна, трэба сабраць яшчэ 50 процантаў, каб поўнасцю выканаць свае самаабавязацельствы. Безумоўна, нельга.

Ні на мінуту нельга аслабляць тэмпы кампаніі, якую, да рэчы, можна было-б даўно закончыць, калі-б усе райарганізацыі адносіліся з той увагай і сур'ёзнасцю, якую яна заслугоўвае. Вось **Ушацкі** і **Чырвонапольскі** раёны. Яны на працягу двух месяцаў упарта ігнаравалі кампанію. Неадпаразовыя ўказанні «Звязды» ўрэшце прымусілі раённыя арганізацыі ўсхапянуцца, але зноў-такі яны абмежаваліся фармальным уключэннем. У выніку Ушацкі раён, [illegible] лад, кераваў усяго 921 руб., [illegible] вопапольскі і таго менш—500 [illegible] Раённыя арганізацыі праявілі [illegible] тычную слепату, недаацанілі [illegible] ніі, не ўзначалілі яе, не разгарнулі масавай работы.

Не намнога апярэдзілі іх **Касцюковіцкі, Асвейскі, Клімавіцкі, Шклоўскі, Крычаўскі, Полацкі, Рагачоўскі, Сенненскі, Ст.-Дарожскі, Талачынскі, Хойніцкі, Слуцкі, Церахоўскі, Чавускі, Чачэрскі, Чашніцкі** і інш. раёны. Яны не выканалі самаабавязацельстваў і на 50%, не кіравалі кампаніяй. Асобна трэба адзначыць адставанне такіх прамысловых раёнаў як **Магілеўскі, Барысаўскі і Жлобінскі.**

Толькі Менскі, Віцебскі, Гомельскі і Смалявіцкі раёны перавыканалі самаабавязацельствы, паказаўшы узоры большэвіцкіх адносін да кампаніі. **Менскі** раён сабраў 213.256 руб., **Віцебскі**—139.242 руб., **Гомельскі**—109.463 рубл. і **Смалявіцкі**—22.440 рубл. Увесь «сакрэт» паспяховага правядзення кампаніі—у шырока разгорнутай масавай рабоце, у апэрацыйным кіраўніцтве кампаніяй і ўзнясці яе на палітычна-прынцыповую вышыню.

Адстаючыя раёны павінны раўняцца па перадавых, неадкладна ўзняць тэмпы па зборы сродкаў. На аснове шырокага разгортвання соцыялістычнага спаборніцтва, актыўнай дапамогі грамадскага буксіра забяспечыць хутчэйшае завяршэнне кампаніі.

На бягучым рахунку 1.007.721 рубель

За 14 кастрычніка на бягучы рахунак Дзяржбанка № 160-7814 паступіла 10.466 рублёў. Ад арганізацый і ўстаноў г. **Менска:** 39 ФЗС—18 руб.; арцелі «Чырвоны інвалід—85 руб.; менскай ТЭЦ—12 руб.; алейна-маргарынавага траста—29 р.; ад саўгаса «Комсамолец»—457 руб. Паступіла з раёнаў: **Полацкага**—1780 руб.; **Бешанковіцкага**—450 р.; **Брагінскага**—360 руб.; **Буда-Кашалёўскага**—624 руб.; **Дрысенскага**—457 руб.; **Жыткавіцкага**—521 руб.; **Уваравіцкага**—549 руб.; **Пухавіцкага**—1108 руб.; **Петрыкоўскага**—1025 руб.; **Смалявіцкага**—400 руб.; **Стара-Дарожскага**—458 руб.; **Ушацкага**—632 руб.; **Чэрвеньскага**—64 руб.; **Магілеўскага**—44 руб. і **Талачынскага**—1378 рублёў.

З пачатку збора на бягучы рахунак Дзяржбанка паступіла 1.007.721 руб.

Пастанова рэспубліканскай камісіі па чыстцы КП(б)Б

У сувязі з паступіўшымі ад гарадоцкай райкамісіі па чыстцы матэрыялаў аб дапушчэнні т. Еўдас'евым, у бытнасць яго старшынёй гарадоцкага РВК, фактаў незаконнага атрымання для райвыканкома ад розных арганізацый прадуктаў, разбазэравання насенных фондаў, а таксама нерэагавання з яго боку на заўважанасць аддзелаў РВК класава-чужымі элементамі і факты скрыўлення класавай лініі, — тав. Еўдас'ева, зараз працуючага ў Белзагатабожжа, для праходжання ім чысткі, згодна просьбы райкамісіі, вярнуць у гарадоцкую парт-арганізацыю.

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б.

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б выклікае ў гор. Менск (ЦКК КП(б)Б — Совецкая, 55) для разбора апеляцый на рашэнні раённых камісій па чыстцы наступных т. т.:

На **ЧЭРВЕНЬСКАМУ РАЁНУ** — на 17-X-33 г. да 10 гадзін раніцы:

Каждана С. А., Хамякова А. Н., Раўтовіча Н. Н., Балоціна С. Р., Гольдзіна В. В., Старасельскага К. А., Ласіцкага С. Ф., Гольдмана Б. Ш., Гурынава К. С., Ермака М. М., Ялоза Б. Ф., Майсеева В. А., Мільмана М. З., Левіна М. Х., Кантара М. Б., Кудзіна В. А., Свірскага С. С., Міроненка П. Я.

На **БЯРЭЗІНСКАМУ РАЁНУ** — на 19-X — 33 г. да 10 гадзін раніцы:

Якімовіча А. Г., Жукоўскага М. І., Драко І. В., Бурэта Л. М., Драко Ф. В., Калячка П. М., Элентуха Д. Б., Печаня П. А., Сапаўя Е. Н., Багданава С. Р., Губіча А. Г., Альшэўскага Ф. П., Маханько В. Д., Гапецкага А. Д., [illegible] І. О., Кучуна М. Н., Карасіка С. Р., Падасіна Я. Н., Міселя П. П.

На **МЕНСКАМУ РАЁНУ** — на 20-X—33 г. да 10 гадзін раніцы:

Сапажейчык М. Е., Ландо М. Я., Вэрэйса С. І., Купрэйчыка А. К., Прускушкіна С. Б., Дрэйзіна (кушнярная фабрыка), Сіндэра І. І., Гольфанда Х. І., Лехчыка С. Б., Райхнодэля Б. Я., Дукорскага З. А., Курмгіна С. В., Карушына М. Г., Хіжняўца І. С., Райхельсона Е. М., Мілюковскага Р. А., Радумскага І. І., Грабер Б. М.

На старшыню райкамісіі ускладзецца адказнасць на забеспячэнне выканання гэта рашэння на пасяджэнне.

Рэспубліканская камісія па чыстцы КП(б)Б.

Адказны рэдактар Г. Н. БРАГІНСКІ.

ДЗЯРЖ. ЯЎРЭЙСКІ ТЭАТР
вул. ВАЛАДАРСКАГА
ДАМЭЦ МЮЗІК-ХОЛ
15 і 16 кастрычніка
АПОШНІЯ 2 ГАСТРОЛІ
ЭЎРАПЕЙСКАГА ІЛЮЗІЯНІСТА
КІО
з яго 18 асістэнтамі.
Новая праграма! — Новыя ілюзіі!
Таксама ўдзельнічае ўся трупа.
Печ. у 8 г. 30 м. веч. Каса—ад 12 г. дня.

„Чырвоная Зорка" Каса—ад 1 г. дня. Гукавы мастацкі фільм 2 СУСТРЭЧЫ

Кіно Інтэрнацыянал КВЕТКА КАХАННЯ

„СПАРТАК" Каса з 4 г. дня. Выдатны трукавы фільм КРЫЛЛІ драма ў 6 частках.

ДЗІЦЯЧЫ ГУКАВЫ кіно-тэатр ДВА ДРУГА МАДЗЕЛЬ і ПАДРУГА камедыя ў 7 частках

Кіно „ПРОЛЕТАРЫЙ" Мастацкі совецкі фільм
ЦАНА ЧАЛАВЕКА
драма ў 6 частках.

Даводзіцца да ведама студэнтаў ХІМІКА-ТЭХНАЛ. ФАКУЛЬТЭТА
Беларускага політэхнічнага інстытута (былыя групы 12, 13, 15, 17, 18)
што заняткі пачынаюцца 20-X-33 г. а 9 гадз. раніцы.
Яўка абавязкова.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР ЮНАГА ГЛЕДАЧА
абвяшчае прыём акторaў
як з прафесіянальных тэатраў, так і з мастацкіх самадзейных гурткоў.
Прымаюцца мужчыны і жанчыны ва ўзросце ад 16 да 35 год. з адукацыяй не ніжэй семігодкі, маючыя адпаведную здольнасці навыкі сцэнічнай працы.
Заявы прымаюцца да 1 лістапада г. г.
Для паступлення неабходны наступныя дакументы: аб сацстановішчы, аб адукацыі, характарыстыка аб грамадскай рабоце.
Да іспыта падрыхтаваць апавяданне, байку, верш.
Адрас: Менск, Савецкая вул., памяшканне польскага тэатра. БелТЮГ'а.

ВАСІЛЕВІЦКАЯ ШКОЛА ЛЕСПРАМГАСВУЧА
праводзіць сенні набор у школу у колькасці 150 асоб, з тэрмінам навучання 6 месяцаў па наступных спецыяльнасцях:
1. Загатоўка і раскрыжоўка цвёрдалісцявых і хваёвых парод з наборам 60 асоб.
2. Па распрацоўцы несаных і колатых сартыментаў (клёпка шведзкі, эгіпецкія балкі, спіцы і інш.) з наборам 90 асоб.
Па скончэнні школы вучні атрымліваюць назву кваліфікаванага старэйшага рабочага-брыгадзіра па вышэйпаказаных спецыяльнасцях.
Скончыўшыя школу таксама маюць права пасля трохгадовай працы на вытворчасці паступіць у тэхнікумы, рабфакі і ВНУ.
У школу прымаюцца асобы, скончыўшыя 7 груп семігодкі, у асобных выпадках дапускаюцца да прыёма з меншай падрыхтоўкай, але не ніжэй 4-х груп. Узрост паступаючых у школу — не ніжэй 17 год.
У першую чаргу прымаюцца дзеці—рабочых-ударнікаў, калгаснікаў і служачых-спецыялістаў. Вучні забяспечваюцца стыпендыяй і інтэрнатам на 100 проц. Пры школе—сталоўка, пральня і лазня.
Для паступлення ў школу патрэбна падаць наступныя дакументы: аб адукацыі, узросце, стане здароўя, сац. становішчы, анкета, засведчаная месцовымі органамі, паштовых марак на 40 кап.
Тэрмін падачы заяў—да 20 кастрычніка 1933 г. Пачатак заняткаў—з 1 лістапада 1933 г.
Жадаючыя паступіць у школу маюць права к паказанаму тэрміну з'явіцца ў школу з дакумантамі для залічэння, не чакаючы паведамлення школы.